СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.11, 18.24, 12.13;
Віцебск — 6.00, 18.14, 12.14;
Магілёў — 6.00, 18.13, 12.13;
Гомель — 5.55, 18.12, 12.17;
Гродна — 6.23, 18.41, 12.18;
Брэст — 6.27, 18.38, 12.12.

МЕСЯЦ:
Поўня 18 сакавіка.
ІМЯНІНЫ
Лазара, Апанаса; Бенедыкта, Любаміра.

ЗВЯЗДА

21 САКАВІКА 1992 г. субота, № 59 (21837)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

ВОЗГАЛАС

ЦЯЖКІ ШЛЯХ ДА ЗГОДЫ

НАШ СПЕЦЫЯЛЬНЫ КАРЭСПАНДЭНТ ПЕРАДАЕ З КІЕВА

«Я думаю, што мы дамовімся», — сказаў журналістам у аэрапорце Кіева С. Шушкевіч, Старшыня ВС Беларусі.

Аптыміст Станіслаў Станіслававіч! Бо дамовіцца па вынесеных на абмеркаванне пытаннях удзельнікам сустрэчы вельмі няпроста. Нават не адразу быў сфарміраваны парадак нарады. Спачатку было прапанавана 32 пытанні. Потым удзельнікі зразумелі, што не паспеюць і абмежаваліся меншай колькасцю. Пытанні можна ўмоўна выдзеліць у тры блокі: эканамічныя праблемы, ваенныя справы і аб мірным суіснаванні краін СНД. Апошняе паступова ўжо вырастае ў праблему нумар адзін. Пра гэта з вялікай трывогай гаварыў ва ўступным слове Прэзідэнт Украіны Л. Краўчук. Ён адзначыў, што ніводнага буйнога пытання ў рамках СНД пакуль што вырашыць не ўдалося.

Ці стане гэта сустрэча пераломным момантам у жыцці Садружнасці? Ёсць шмат прычын сумнявацца ў гэтым. Але ёсць і святло ў канцы тунеля. Гэта ў першую чаргу ўсведамленне лідэрамі дзяржаў таго, што мы зараз падышлі ў спрэчках, прэтэнзіях адзін да аднаго да краю бездані. Сітуацыя пагаршаецца з кожным днём. І толькі агульная згода народаў і іх лідэраў папярэдзіць катастрофу. Такі намер ёсць ва ўдзельнікаў нарады. Хочацца спадзявацца, што падпісаныя імі дакументы стануць пачаткам нармалізацыі абстаноўкі ў СНД.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ХАТКУ КУПІМ, БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!

ЖАБІНКА. Як паведамляе раённая газета «Сельская праўда» прыватызацыя жылля тут набірае тэмпы. Калі летась было выкуплена за год 102 кватэры і каля 30 асабнякоў, дык сёлета ўжо 170 кватэр. Гарадскі бюджэт папаўняецца за кошт дзяржпошліны. З пачатку года яе сума дасягнула 200 тысяч рублёў.

Бела ПАН.

ПРАБЛЕМА: НЕ ЧЫМ СЕЯЦЬ, А ЗА ШТО КУПІЦЬ

Поўдзень рэспублікі — Брэстчына і Гомельшчына — ужо паспеў пасеяць крыху аўсу на тарфяніках. Ідзе вывазка гною, якога будзе ўнесена, паводле разлікаў спецыялістаў, крыху менш, чым летась. Не ўнікае, як быццам, сур'ёзных праблем і з насеннем. Даволі яшчэ нізкія тэмпературы на глебе і ў паветры не дазваляюць пакуль рабіць штосьці грунтоўнае. Дарэчы, не толькі яны.

Па словах намесніка начальніка ўпраўлення Мінсельгаса І. Савені, галоўная праблема заключаецца не ў насенні і гною, мінеральных угнаеннях і тэхніцы. Усё гэта ёсць, і ў патрэбных колькасцях. Няма грошай.

Практычна ніхто зараз не купляе новую тэхніку, і гэта яшчэ паўбяды. У рэшце рэшт ёсць старая і нейкія запасы запчастак, зробленыя па прынцыпу «ты — мне, я — табе». Горш з мінеральнымі ўгнаеннямі, ядахімікатамі. Іх трэба выкупляць, але за якія, прабачце, шышы? Мінсельгас дае рэкамендацыі: больш займацца агратэхнікай замест накачвання глебы ядахімікатамі. Парада слушная, аднак гэта — лішні расход паліва, якое, у сваю чаргу, сёлета будзе, відаць, асноўным дэфіцытам.

Як вядома, Нацыянальнаму банку дадзена даручэнне дапамагчы сельскай гаспадарцы крэдытамі. На нядаўняй прэс-канферэнцыі старшыня праўлення Нацыянальнага банка С. Багданкевіч гэта пацвердзіў і запэўніў, што з крэдытамі для вёскі ўсё вырашана. Значыць, пытанне заключаецца ў велічыні тэрміну, за які рашэнне вярхоўных улад дойдзе да ўлад (і банкаў) мясцовых. Будзем спадзявацца, што гэта здарыцца хоць за 2 тыдні да пачатку масавай сяўбы.

А наогул, сёлета ўпершыню за гады савецкай улады сельская эканоміка сапраўды стане эканомкай.

С. ПАУЛАЎ.

Два банкруты: Масква і Санкт-Пецярбург

На мяжы спынення вытворчасці Пінскі мясакамбінат. Больш як 40 мільёнаў рублёў запазычылі прадпрыемству спажыўцы ягонай прадукцыі з Масквы і Санкт-Пецярбурга. Вось і давялося спыніць пастаўку мяса ў гэтыя гарады і амаль поўнасцю адмовіцца ад прыёму жывёлы ў мясцовых калгасаў. Дзесяткам людзей прапанавана пайсці ў водпуск.

Калектыў камбіната мог бы выйсці з фінансавага крызісу, рэалізуючы прадукцыю на біржах, але Мінсельгаспрад не дае пакуль дазволу на гэта. Тым часам маразільныя камеры забіты пад завязку.

Як спыніць залаты паток?

1 кг 277 г золата на 452 тысячы рублёў у гэтым годзе канфіскавана работнікамі мытні «Заходні Буг» у тых, хто ад'язджае за мяжу. «Затрымана» таксама 37,5 тысячы долараў ЗША і 1 млн. 773 тысячы «драўляных». У гандаль вернута 1.200 бутэлек спіртнога на суму 60 тысяч рублёў. Акрамя гэтага, канфіскавана 15 газавых пісталетаў і 150 газавых балончыкаў.

ПОСТАЦІ АДРАДЖЭННЯ

Браты ЕРМАЛОВІЧЫ Лявон, Мікола, Валянцін.

І золата дум падарыць Беларусі...

Калі вам хто скажа, што нас безнадзейна і незваротна засмактала дрыгва бяспамяцтва, выраджэння і нялюдскасці; калі будуць сцвярджаць, што згасла і не ўзгарыцца святло спадзяванняў і святога служэння Бацькаўшчыне; калі стануць пераконваць, што меў розум толькі той, хто нажываў скарб у сваім доме, — не верце!

Лепей пазнаёмцеся, хто не ведае: Мікола Іванавіч, Валянцін Іванавіч, Лявон Іванавіч, і ўсе — Ермаловічы. Тры браты, тры нястомныя рупліўцы на нашай не надта ўдзячнай беларускай ніве. Іх вечарына, уладкаваная не так даўно ў Доме літаратара, адгукнулася ў сэрцы ціхай і роўнай радасцю: прычакалі вясны! Той вясны, і тут я вазьму ў падмогу словы Генадзя Каханоўскага, што прыйшла пасля цяжкага, на многа гадоў, зазімку, які не даваў раскрывацца талентам — непадкупным і яркім. Тым, што праз халадэчу бяздушша і бяспамяцтва цягавіта і неадольна неслі— нам жаі — наша, беларускае, людскае, цёплае.

Сыны койданаўскага селяніна, фальваркоўца, зацятага працаўніка, а таму, вядома ж, «ворага народа», якога прытулілі ў 38-м адны з параскіданых паўсюдна Курапатаў, яны не спакусіліся лёгкім шляхам аднадушнага і рабскага ўхвалення не надта дальнабачных уладароў. Яны выбралі свой шлях — у калдобінах і ямах, у поце і горычы. Іхняе здабыванне праўды не было лягчэйшым за бацькава здабыванне хлеба.

Лявон Іванавіч настаўнічаў на Койданаўшчыне. Выкладаў родную мову і літаратуру, амаль 40 гадоў кіраваў занятка мі драмгуртка — вядома ж, беларускага. Каб роднае слова гучала не толькі на ўроках, а і са сцэны, каб заставалася сваім, прывычным, жаданым. А да ўсяго — нястомнае краязнаўства, росшукі невядомага, схаванага пад напластаваннямі ідэалагічнай блізарукасці, адрачэння ад сваёй гісторыі на карысць манкурцкай «светлай будучыні». Разам з вучнямі адшукаў магілу таленавітага беларускага паэта, мастака, грамадскага дзеяча Каруся Каганца, вось ужо колькі гадоў даглядае яе, апякуецца, нягледзячы на халодную, мякка мовячы, першапачатковую рэакцыю мясцовых улад. Як жа — прозвішча не ўпісалася ў кагорту адданых ленінцаў ці слаўных прадстаўнікоў сацрэалізму...

— Я многа ведаў, ды не ўсё мог сказаць дзецям. Карцела расказаць пра тое, напрыклад, што чулася беларускаму селяніну ў пошчаку салоўкі: «Высылка-высылка, Салаўкі-Салаўкі — рас-стрэл...»

Спадзяванні, асветніцтва, ахвярнасць — каго ні вазьмі з братоў, да кожнага дастасуюцца гэтыя паняцці без нацяжак. У зацярушаным ядзерным попелам, парадзелым на насельнікаў Краснаполлі дагэтуль працуе Валянцін Іванавіч. Ён—кіраўнік вядомага ў рэспубліцы народнага тэатра, створанага братамі Шашалевічамі — Васілём ды Андрэем (Мрыем). Гучыць роднае слова са сцэны, гукае беларусаў да духоўнае працы на карысць Бацькаўшчыны. Ён шукае таленты сярод тых, з кім жыве, гуртуе іх, стаўшы духоўнай апорай для апантаных беларушчынай і мастацтвам. Разляцеліся многія ягоныя вучні далёка ад параненага атамам краю, ратуючы дзетак, ды павезлі з сабою іскрынку светлага неўтаймоўнага агню яднання сэрцаў праз высокае, сапраўднае, жывое.

А ўзгарэлася ўсё ад старэйшага з братоў — Міколы Іванавіча.

— Ён у нас гісторыю выкладаў, — згадвае Валянцін Іванавіч. — Брат братам, а мне вывадзіў тройку: не мог дараваць нікому няўвагі да нашай мінуўшчыны, стараўся, каб кожнага яна зацікавіла, запаланіла, каб абудзілася жаданне яе ведаць і весці справу беларускага Адраджэння.

Многа гадоў з таго мінула, а Ермаловіч-старэйшы захаваў патрабавальнасць да сябе і да іншых у пытаннях глыбокіх і сапраўдных ведаў, чыстых ад кан'юнктурных меркаванняў. Няхай паўсюдна зацята сцвярджалі і паўтаралі мільённымі накладамі, што дзяржаўнасць Беларусь атрымала толькі дзякуючы Савецкай уладзе, — ён даводзіў у сваіх артыкулах, у кнізе «Па слядах аднаго міфа»: не, не так, за плячамі беларусаў — сівыя стагоддзі, магутныя карані. Больш за 20 гадоў блукала кніга самвыдатаўскімі сляпымі староннкамі, адварочваліся рэдактары пры сустрэчах, былі выклікі «куды трэба», звароты ягоных масцітых і больш удачлівых (не ў плане гістарычнай праўды, а на прадмет адваяваных у грамадства даброт) «калег»: «Запретите печатать, он нам мешает». А ён кожныя выхадныя на свае скупыя выкладчыцкія ездзіў з Маладзечна ў «ленінку»: там чакалі летапісы. Да ягонай высокай, нізка схіленай над сталамі постаці прывыклі ў бібліятэцы ўсе: і супрацоўнікі, і наведвальнікі.

Даведаўшыся, што пішу колькі слоў пра Ермаловіча, знаёмы гісторык парыў: абавязкова адзначце, што гэта, бадай, адзіны сярод нас чалавек з камуністычнымі адносінамі да працы — не за ўзнагароду працуе, не за прызнанне, а адзіна дзеля перамогі ісціны, праўды. Побач з такім соромна за сваю бяздзейнасць, пасіўнасць, ляноту, за згодніцтва і маўчанне.

Многім ён дапамог сваімі ведамі, падтрымкай, а хто-ніхто проста і сціпла чэрпаў з адкрытай ім крынічкі, іншы раз забываючы падзякаваць за вадзіцу... А Мікола Іванавіч не ў крыўдзе: абы была ў смак вадзіца чыстая, не ўскаламучаная зменлівымі часінамі і хістаннямі.

— Былі нейкія мутныя, нясветлыя дні, — разважаў Лявон Ермаловіч. — Даводзілася хаваць у сабе тое, аб чым балела сэрца. Прыйшла радасць, няхай і пазнавата. Я зразумеў, што трэба пакаяцца перад людзьмі, перад дзецьмі за кожнае няшчырае слова.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ГІСТОРЫЯ З ФАКСІМІЛЕ

Пасяджэнне Цэнтральнай выбарчай камісіі на гэты раз уяўляла сабой нешта сярэдняе паміж навукова - практычнай канферэнцыяй, дыскусійным клубам і афіцыяльным мерапрыемствам. Наўрад ці бачылі раней гэтыя сцены такі прадстаўнічы народ — народныя дэпутаты рэспублікі, цвет айчыннай навуковай думкі ў галіне грамадазнаўства і права, адказныя работнікі Мінюста, пракуратуры рэспублікі, кіраўнікі юрыдычных службаў урада і Вярхоўнага Савета, прадстаўнікі выканкомаў мясцовых Саветаў, прэса... З якой нагоды — ні выбараў жа, ні якога іншага надзвычайнага здарэння?

Усяму віной, як аказалася, ініцыятыва з рэферэндумам. Выканаўшы аднойчы сваю функцыю і даўшы «дабро» на сур'ёзную палітычную акцыю, Цэнтрвыбарком, як і належыць, не пакідае без увагі ўласна санкцыяніраванае. На гэты раз парадак дня: «Аб растлумачэнні пытанняў, якія ўзніклі пры прымяненні артыкула 11-га Закона «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь». Гаворыцца ў 11-м артыкуле пра тое, што падпісныя лісты, дзе людзі выказваюць сваю згоду на рэферэндум, павінны падпісвацца старшынёй ініцыятыўнай групы (ім з'яўляецца, нагадаем, спадар Анцулевіч) і членам гэтай групы. Яшчэ патрэбна пячатка «выканаўчага і распарадчага органа мясцовага Савета». Што ж прывяло да такога вялікага збору ў ЦВК?

Спадар Анцулевіч, які ў прыродзе адзін, павінен паставіць свой уласнаручны подпіс на кожным з падпісных лістоў, якіх у рэальнасці многія і многія тысячы — подпісаў, як мы ведаем, трэба сабраць 350 тысяч. Прычым збіраюцца яны не толькі ў Мінску, а па ўсёй рэспубліцы. Няхай сабе чытач уявіць хоць адзін варыянт, які дазволіў бы ажыццявіць гэту спраграмаваную заканадаўцамі аперацыю: аднаму чалавеку «завізіраваць» безліч дакументаў, а да ўсяго з'явіцца ў выканкомы (ад Хоцімскага да Брэсцкага), каб гэту акцыю правесці перад строгім чалавекам з пячаткай.

Выйсце было знойдзена. На падпісных лістах з'явілася факсіміле подпісу кіраўніка ініцыятыўнай групы. Пазначаныя ім падпісныя лісты рушылі ва ўсе куткі рэспублікі.

Вось гэтая фабула і стала асноўнай падставай для вельмі напружаных і драматычных спрэчак у Цэнтрвыбаркоме: ці лічыць факсіміле подпісам? Аўтарытэтныя меркаванні наконт гэтага выказвалі А. Дударэнка і Т. Пятрова з Мінюста, А. Доўбаш з пракуратуры рэспублікі, кіраўнік юрыдычнай службы Саўміна В. Бараўцоў, загадчык юрыдычнага аддзела Сакратарыята ВС Рэспублікі Р. Васілевіч, прафесар БДУ А. Галаўко, навукоўцы Л. Русак, В. Шабайлаў, А. Цікавенка, прадстаўнікі выканкомаў А. Курач, Ф. Лісовіч, С. Казанскі і іншыя. Пазнаёміць чытача з іх аргументамі (вельмі разнастайнымі) не дазваляе размер матэрыялу, таму адзначу толькі асноўныя. Факсіміле — не подпіс, а толькі яго копія, таму лісты не могуць быць прызнаны сапраўднымі, правільнымі. Як быць работнікам выканкомаў, якія мусяць засведчаць пячаткай факсіміле? Хто будзе несці адказнасць, калі звесткі ў лістах акажуцца сфабрыкаванымі?

А галоўнае пытанне — як быць з рэферэндумам, падрыхтоўка да якога набрала поўную сілу? Згодна з інфармацыяй У. Анцулевіча і З. Пазьняка, збор подпісаў завяршаецца. Больш за 300 тысяч выбаршчыкаў, прычым палітычна актыўных, паставілі свае подпісы. Закрэсліць іх волевыяўленне — значыць, разважаў старшыня Цэнтрвыбаркома А. Абрамовіч, нейкім чынам паўплываць на законныя права ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці. Тым больш, ставіў пытанне З. Пазьняк, чаму такая катэгарычнасць узнікла тады, калі столькі зроблена?

Ва ўсім абаваты заканатворцы, гаварыла Л. Русак, і ў Законе аб рэферэндуме праявіўся іх непрафесіянальны почырк.

А. Абрамовіч, на якога выпаў асноўны цяжар па кіраўніцтву дыскусіяй, заўважыў, што, акрамя фармальна-законнай логікі, існуюць рамкі прававога закона. У законе, па ўсім відаць, закладзена норма, немагчымая для выканання. Але паўнамоцтваў выбарчай камісіі хапае толькі на тое, каб даваць тлумачэнні наконт законнасці: па закону ці не? Вобразна кажучы, поезд пайшоў, а наперадзе можа не аказацца рэек.

...Спрэчкі зацягнуліся. Згадваліся і многія іншыя акалічнасці, звязаныя са зборам подпісаў. Камісія дала свае тлумачэнні. Што далей?

Кар. «Звязды».

ПАСТАНОВА

Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь

Зыходзячы з інтарэсаў беларускага народа і дзяржаўных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, кіруючыся канстытуцыйным законам — Дэкларацыяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, пастановамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 20 верасня 1991 года «Аб стварэнні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», ад 11 студзеня 1992 года «Аб узброеных сілах, якія дыслацыруюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь з 20 сакавіка 1992 года прыступіць да фарміравання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Прадставіць на зацвярджэнне Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь структуру Узброеных Сіл, іх колькасць і парадак матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

2. Гэту пастанову ўвесці ў дзеянне з моманту прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

18 сакавіка 1992 г. г. Мінск.

ПАСТАНОВА

Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб адкліканні з Азербайджанскай Рэспублікі, Рэспублікі Арменія, Рэспублікі Грузія і Малдовы ваеннаслужачых тэрміновай службы — грамадзян Рэспублікі Беларусь і ўсіх прызваных з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

У адпаведнасці з Дэкларацыяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, Законам «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь», а таксама ў сувязі са складаным палітычным становішчам у Закаўказскім рэгіёне і Малдове, вядзенням там баявых дзеянняў, у ходзе якіх ёсць забітыя і параненыя, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Адклікаць з Азербайджанскай Рэспублікі, Рэспублікі Арменія, Рэспублікі Грузія і Малдовы ваеннаслужачых тэрміновай службы — грамадзян Рэспублікі Беларусь і ўсіх прызваных з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Галоўнаму камандаванню Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі Садружнасці Незалежных Дзяржаў забяспечыць вывад на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь вышэйназваных ваеннаслужачых тэрміновай службы да 20 красавіка 1992 года.

3. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць выкананне дадзенай пастановы.

4. Гэту пастанову ўвесці ў дзеянне з моманту прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

13 сакавіка 1992 г. г. Мінск.

РЭАЛІЗУЮЦЦА ПЛАНЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

20 сакавіка з рабочым візітам у Мінск прыбыла група экспертаў Камісіі еўрапейскіх супольніцтваў, якую ўзначальвае загадчык аддзела тэхнічнай дапамогі Супрацоўніцтву Незалежных Дзяржаў пан Хаар. У Доме ўрада адбылася іх сустрэча з прадстаўнікамі дзелавых колаў, міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі, якая праходзіла пад старшынствам Нацыянальнага каардынатара тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Камісіяй еўрапейскіх супольніцтваў, намесніка Старшыні Савета Міністраў Беларусі М. І. Дземчука. На ёй вызначаны асноўныя напрамкі праграмы тэхнічнай дапамогі з боку Камісіі нашай рэспубліцы на 1992 год.

«Ад слоў — да справы» — так можна вызначыць цяперашні этап у развіцці сувязей Беларусі з індустрыяльнымі краінамі Захаду.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

НАТАТКІ З СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА

Несакрушальная і легендарная... Якой будзе яна ў Беларусі?

Вакол Узброеных Сіл былога Саюза ССР па-ранейшаму напаляюцца страсці. Літаральна кожны дзень мы даведваемся то пра «паводзіны» цэлых рэспублік наконт іх, то пра пазіцыі самых высокапастаўленых кіраўнікоў, то пра канфлікты вайскоўцаў з мясцовымі ўладамі ў тым ці іншым рэгіёне... Нярэдка гэтыя паведамленні трывожныя і балючыя, іншы раз яны проста здзіўляюць. А тым часам сама армія перажывае не лепшыя свае часы. Украіна мае сваю канцэпцыю, Расія — сваю; Малдавія, Арменія, Грузія таксама імкнуцца сказаць сваё «я»...

Чытачы, мабыць, памятаюць, што да ваенных пытанняў наш парламент падступаўся ўжо не адзін раз. Але... Не хапала ў народных дэпутатаў падрыхтаванасці, паразумення і згоды, каб вырашыць іх канструктыўна, так, як патрабуе гэтага сама цяперашняя абстаноўка. І хоць пытанні рыхтаваліся загадзя, цяпер фарсіраванага разгляду іх запатрабаваў ад народных выбраннікаў сам час.

Іх разгляд парламент вырашыў пачаць за зачыненымі для журналістаў дзвярамі. Праўда, пры гэтым дапусціў адну прыкрую для сябе недарэчнасць: асноўны даклад «Аб абароне Рэспублікі Беларусь» выконваючы абавязкі міністра абароны генерал-палкоўнік Пётр Чавус зрабіў... у эфір беларускага радыё, паколькі трансляцыя напярэдадні не была адключана. Навошта было «закрываць дзверы» назаўтра, мы, уласна кажучы, так і не зразумелі.

Парламентарыі Беларусі, выдатна ведаючы аб тым, што ваенныя пытанні з усёй вастрынёй паўстануць на сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД у Кіеве, імкнуліся, як нам падалося, да галоўнага: пераканаць садружнасць у тым, што ў Беларусі ёсць свая цвёрдая пазіцыя наконт лёсу і будучыні армії. І тут (хоць, зазначу, што гаворкі аб гэтым не было) многія прыгадалі, як настойліва, а часам проста прадбачліва, вяла сябе некалькі месяцаў назад парламенцкая апазіцыя БНФ, прапаноўваючы разгледзець яшчэ тады комплекс ваенных праблем. Дзве ж пастановы, прынятыя 20 верасня мінулага года і 11 студзеня сёлета, хоць і называліся «Аб стварэнні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь» і «Аб Узброеных Сілах, якія дыслацыруюцца на тэрыторыі Беларусі», сітуацыю ніколькі не прояснілі, і рэспубліка, такім чынам, зноў, у каторы ўжо раз, з пастаноўкай і вырашэннем надзённых пытанняў яўна запазнілася.

Але, як кажуць, лепш позні, чым ніколі... Прапанаваныя на разгляд дэпутатаў праекты законаў аб абароне, аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, аб статусе ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў і аб усеагульным вайсковым абавязку і вайсковай службе прыйшліся ім даспадобы. Прынамсі, як стала вядома з-за зачыненых дзвярэй, і абмеркаванне іх праходзіла сур'ёзна і канструктыўна. Законы прыняты ў першым чытанні.

Хоць спрэчных пытанняў паранейшаму хапае. Скажам, адно з іх, даволі значнае: якія войскі адносіць да сіл стратэгічнага прызначэння, а якія — да агульнага, гэта значыць да тых, якія адыдуць пад юрысдыкцыю рэспублікі? Як засведчыў народны дэпутат Валянцін Голубеў, гэта пытанне Масква мае намер вырашаць так, як захоча, і сёння адносіць да стратэгічных сіл нават... будаўнічыя войскі. Ці вось яшчэ адна праблема: народным дэпутатам стала вядома аб вывазе ваеннай маёмасці Беларускай акругі за межы рэспублікі. У свой час Вярхоўны Савет прыняў спецыяльную пастанову, у якой Савету Міністраў Беларусі і камандуючаму войскамі акругі генерал-палкоўніку Анатолю Кастэнку даручана строга кантраляваць гэты працэс, аднак яна не выконваецца. Слушную прапанову ўнёс наконт гэтага старшыня адной з парламенцкіх камісій Пётр Садоўскі: узяць пад часовую юрысдыкцыю гэтую маёмасць, але яна чамусьці не прайшла.

Няпроста зразумець іншы раз нашых народных выбраннікаў...

«Арыгінальную» (інакш яе і не назавеш) ідэю падаў у час абмеркавання ваенных пытанняў народны дэпутат Барыс Макейчанка: нічога не прымаць, адкласці абмеркаванне да аўторка, гэта значыць, да высвятлення адносін у Кіеве... Нішто сабе прапанова, ці не праўда? І дакуль гэта мы будзем глядзець у рот былым сваім «старэйшым братам»?!

Практычна не адыходзіў ад мікрафона ў час абмеркавання праблем будучых Узброеных Сіл рэспублікі лідэр БНФ Зянон Пазьняк. «Мы не маем зараз ні міністэрства абароны, ні міністра, ні Узброеных Сіл наогул, — заявіў ён. — Колькі гэта будзе цягнуцца? Мы павінны прыняць рашучыя меры...» І хоць Старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч сказаў на гэта: «Савет Міністраў распрацаваў і падпісаў парадак утварэння міністэрства, яго структуру...», ніхто, здаецца, з дэпутатаў такога дакумента не бачыў.

Больш таго, вакол партфеля будучага міністра абароны Рэспублікі Беларусь, як стала вядома нам на прэс-канферэнцыі ад намесніка старшыні Камісіі па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абаронаі і барацьбы са злачынасцю Леаніда Прывалава, пачалася сапраўдная закулісная барацьба. Сёння гэтыя абавязкі, як вядома, выконвае генерал-палкоўнік Пётр Чавус. На пасаду ён заступіў зусім нядаўна, але зрабіць паспеў ужо вельмі многа. Аднак нейкія сілы, хоць і невядомыя, але, мяркуючы па ўсяму, уплывовыя і моцныя, штурхаюць на пост яшчэ тры кандыдатуры: цяперашняга камандуючага войскамі Беларускай акругі генерал-палкоўніка Анатоля Кастэнку, першага намесніка камандуючага БВА генерал-лейтэнанта Паўла Казлоўскага і начальніка штаба Туркестанскай ваеннай акругі генерал-лейтэнанта Георгія Шпака. Хто з іх пераможа (а гэта будзе, несумненна, ганаровая перамога ў вострай канкурэнцыі), пакажа час, але нам, журналістам, гэтая вестка аб барацьбе падалася несумленнай і не дарэчы. «Калі ў гэтым пытанні мы дадзім ход кар'ерызму, — сказаў Леанід Прывалаў, — поспеху ў ваенным будаўніцтве ў Беларусі не будзе. Закулісныя гульні не робяць гонару ні дзяржаўным мужам, ні ваенным, ні нам, парламентарыям. Інтарэсы справы тут павінны быць вышэй за ўсё...»

Такім чынам, Беларусь, хоць, паўтаруся, і з вялікім спазненнем, на практыцы прыступае да фарміравання Узброеных Сіл рэспублікі. Наперадзе процьма складаных і вострых пытанняў і праблем. Паводле падлікаў спецыялістаў, з якімі мне давялося пагутарыць у перапынках паміж пасяджэннямі сесіі, уласныя Узброеныя Сілы абыдуцца Беларусі амаль у 17 мільярдаў рублёў. Сума, што і казаць, вялікая, астранамічная. Але іншага выйсця сёння няма...

Анатоль МЯСНІКОЎ.

ПАТРЫЁТАЎ — ВЫХОЎВАЮЦЬ

Апатыя і абыякавасць да ўсяго, што адбываецца ў краіне, захапіла і войска. Таму спадары, якія селі за «круглы стол» у Доме літаратара (тыя ж пісьменнік Анатоль Сульянаў, старшыня Беларускага згуртавання вайскоўцаў Мікалай Статкевіч, камандуючы арміяй ППА генерал-лейтэнант Вячаслаў Асмалоўскі), мелі рацыю, калі заклікалі да аднаго, — да веры, якая зможа дапамагчы беларусам развітацца са шматлікімі праблемамі. Ідэальным выйсцем, на думку Мікалая Статкевіча, можна лічыць... беларускі дзяржаўны патрыятызм. Вядома, у нас славутая гісторыя, тым больш ваенная. Але, на жаль, яна схавана і забыта. Таму зараз неабходны такія і мастацкія, і навуковыя творы, якія б раскрывалі тэму ваеннай гісторыі, і перш за ўсё забытых яе перыядаў. Здаецца, яшчэ нідзе ў мастацкай літаратуры не з'явіліся творы пра славутую перамогу пад Оршай, калі 35-тысячнае беларускае войска, абараняючы сваю радзіму, разбіла 80-тысячную армію маскоўцаў. Сёння ўсё гэта трэба давесці да масавага чытача. І тут, зразумела, нядрэнную паслугу можа зрабіць літаратура. Таму на сустрэчы за «круглым сталом» з боку вайскоўцаў і прагучала прапанова аб супрацоўніцтве Саюза пісьменнікаў з Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь: гістарычная ваенная літаратура патрэбна войску.

Яшчэ адна праблема, якая была закранута на сустрэчы, датычыцца беларускіх афіцэраў, якія служаць за межамі рэспублікі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

І золата дум падарыць Беларусі...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Каторы раз за тую вечарыну занудзілася, сціснулася сэрца: хто ж з нас павінен згадваць пра пакаянне? Браты Ермаловічы, — хто не ведаў у працы стомы, хто ахвяраваў здароўем, жыццёвай уладкаванасцю дзеля Беларусі, дзеля яе светлага Адраджэння, — ці мы?

— Я перагледзеў усе тамы нашых энцыклапедый — нідзе няма прозвішча Міколы Іванавіча, — казаў у той вечар Іван Антонавіч Брыль.

Мне тады падумалася: а можа, у гэтым якраз і праўда, і справядлівасць, што няма? Не спяшайцеся абвінаваціць мяне ў зацятай калектыўнай няўдзячнасці. Давайце разам згадаем магчымыя радкі ў той энцыклапедыі: «М. І. Ермаловіч — знакаміты беларускі савецкі гісторык» і г. д. Ці няпраўда, ёсць фальш і няшчырасць у такой выснове? Можна пакінуць яе без каментарыяў, а можна згадаць цэлую кагорту масцітых вучоных мужоў, хто дружна і таленавіта ўзяўся апісваць «найбольш слаўныя і эпахальныя» старонкі нашае гісторыі — ад «Вялікага Кастрычніка» і далей, дакладней, бліжэй да «светлай будучыні». І былі цэлыя інстытуты з найноўшым абсталяваннем, і былі гучныя тытулы, падмацаваныя не такім ужо і посным хлебам надзённым. І быў — Мікола Ермаловіч, што без стомы ўчытваўся ў спарахнелыя старонкі летапісаў; слепнуў — на жаль, у самым прамым і бязлітасным сэнсе слова, — углядаючыся праз стагоддзі ў Вялікае княства Літоўскае; ехаў на сваю (ці не першую?) урачыстую вечарыну ў халоднай электрычцы з Маладзечна...

Хто ж павінен каяцца?

Рытарычнае пытанне. Вядома ж, хто: той, у чыёй душы ёсць святасць і чысціня. Астатнія выбралі лозунг, дзе засведчылі (аслупавалі) свае «ум, честь и совесть». Калі пра сумленне —лозунгамі, то пакаянне — пусты гук, трызненне. Мушу прызнаць, што таварыш Ленін меў рацыю: у кожнай культуры ёсць дзве культуры. Адна — на патрэбу дня (тая, што пазначана ў слоўніках і энцыклапедыях азначэннямі накшталт партыйнасці і сацыялістычнасці), другая—проста культура, проста навука. Апошнія не вымагаюць азначальнай азбукі.

— Куды глядзелі гісторыкі, калі пісалі нашу гісторыю? — гукаў Мікола Іванавіч у сціснаную залу.

Не было адказу. Ён глядзеў — у дакументы эпох, многія іншыя — на лозунгі над прэзідыумамі, дзе сядзелі.

— Мы ўдзячныя старэйшаму брату, што дапамог нам стаць беларусамі, — прызнаўся Валянцін Ермаловіч.

Няхай жа навучыць і нас—сваімі кніжкамі, сваім не надта салодкім, але светлым жыццём. Не станем тапіць у пустой вадзе славаслоўя шчырых і сціплых рупліўцаў нашага Адраджэння — станем проста поруч для агульнай працы. Гэта для іх найлепшая ўзнагарода.

Людміла РЫЖАНКОВА.
Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

***

Высокая вобразнасць і гістарычная дакладнасць уласцівыя творчасці самадзейных артыстаў народнага тэатра Краснапольскага раённага Дома культуры. Сярод іх найбольш удалых пастановак сцэнічная кампазіцыя «Стогны душы» па аднаактных п'есах Максіма Гарэцкага. На гэтым здымку вы бачыце ўдзельнікаў гэтай кампазіцыі настаўніцу нямоўнай сярэдняй школы Веру ПАЛЕЕНКА і супрацоўніка раённай газеты Івана ТКАЧОВА.

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

АБ ЧЫМ СПРАЧАЕМСЯ?

ШТО ТАКОЕ САЦЫЯЛІЗМ, ЯКІ АДНЫ З НАС ГАТОВЫ АБАРАНЯЦЬ, А ІНШЫЯ ЎТОПТВАЮЦЬ У ГРАЗЬ!

1917 год падзяліў свет напалам. 1990-м раскалоў на сацыялізм і капіталізм унутраны свет ледзь ці не кожнага савецкага чалавека. У пустым гастраноме хто з нас не рыначнік? А каля крамы кааператара-спекулянта хто не бальшавік? Мы пачынаем будаваць капіталізм у краіне з баявымі камуністычнымі традыцыямі, ад якіх адмовіцца не можам, ды і не хочам. Ідэі сацыяльнай справядлівасці і роўнасці (нават у галечы) вельмі глыбока сядзяць у патаемных кутках славянскай душы. Успомніце старажытныя народныя казкі аб разумным, але бедным Іванку і дурных, але багатых панах ды папах, аб «добрым цары». Унутры нас жывуць два чалавекі. Адзін—злы і галодны, другі—злы і ідэйны.

Давайце паспрабуем разабрацца, куды мы ідзём і чаго хочам? Ясна толькі адно — што мы, як і ўсе людзі на Зямлі, хочам прагрэсу. Паводле Маркса, галоўная мерка прагрэсу — прадукцыйнасць працы, галоўнае грамадскае багацце — вольны час грамадзян. Па абодвух гэтых параметрах мы жабракі. Адсутнасць эксплуатацыі ў нас прывычна даказваюць ад процілеглага — адсутнасцю фігуры эксплутатара - ўласніка. А тое, што мільёны людзей штогод працуюць на сябе толькі чвэрць рабочага дня, прынята лічыць нармальным сацыялістычным накапленнем.

Дык што ж такое сацыялізм, які адны з нас гатовы абараняць, а іншыя ўтоптваюць у грязь? Першыя, напэўна, скажуць — гэта грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці. Другія будуць сцвярджаць, што гэта тое, што пабудавалі камуністы ў былым СССР, — роўнасць у галечы. І таксама правільна, як і тое, што камунізм ёсць Савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны...

Прыватная капіталістычная ўласнасць — гэта адносіны паміж уласнікам капіталу і ўласнікам працы. Ледзь ці не паміж капіталам і працай, паколькі, калі праца цесна звязана з пралетарыем, то капітал мае патрэбу ва ўласніку толькі як у пасрэдніку на рынку працы — наняць упраўленцаў, рабочую сілу. Ужо на стадыі канкурэнцыі капітал (гаспадарка, грошы, машыны) выходзіць з падпарадкавання, як бы выбіраючы сабе падыходзячага ўласніка.

У кастрычніку 1917-га ўласнік капіталу быў выкінуты, як непатрэбны пасрэднік. Жабрак пазбавіўся апошняга права — прадаваць сваю працу, якая цяпер экспрапрыіравалася і размяркоўвалася нароўні з сыравінай. Адпаведна адпала неабходнасць у рынку. Адбылося не фармальнае, а рэальнае абагульненне. Толькі вось чаго? Грамадствам — капіталу, або капіталам — грамадскай працы?

Супаставіўшы ўсё гэта, мы не можам не прызнаць, што наш сацыялізм — па сутнасці абсалютная, нахабная перамога капіталу над асобай, самая запніваючая стадыя капіталізму.

Маркс, абылганы і перафразіраваны да непазнавальнасці рускімі і савецкімі даследчыкамі, папярэджваў:

«Першае станоўчае скасаванне прыватнай уласнасці, грубы камунізм, ёсць толькі форма праявы гнюснай прыватнай уласнасці... На першым часе ён выступае як усеагульная прыватная ўласнасць», «Гэты камунізм, які адмаўляе ўсюды асобу чалавека, ёсць толькі паслядоўнае адюстраванне прыватнай уласнасці». «Для такога роду камунізму супольнасць ёсць толькі супольнасць працы і роўнасці заработнай платы, выплачваемай... абшчынай як усеагульным капіталістам» («Эканамічныя і філасофскія рукапісы 1844 года». Сачыненні. Т. 42, стар. 114, 115, 116).

Цяпер зразумела, што мы пабудавалі? Ці трэба пасля гэтага выходзіць на плошчы з лозунгамі тыпу: «Не аддадзім заваёвы сацыялізму». Яго проста не было ў нас і няма.

Але ці маюць рацыю тыя, хто топча сацыялізм у грязь, лічачы, што сацыялізм — гэта тое, што пабудавана ў нас, а тое, што пабудавана ў ЗША, Германіі, Швецыі, Японіі — капіталізм. І што цікава, займаюцца гэтым людзі, якія ніколі не трымалі ў руках ні кніг Маркса, ні кніг яго ідэйных праціўнікаў. А калі і ведаюць некага з вялікіх філосафаў, то толькі па цытатах.

Ужо хто-хто, а сусветная буржуазія выкарыстала і працы Маркса, і плён рэвалюцыі ў Расійскай імперыі. Няхай не адразу, неахвотна, пад пагрозай рэвалюцыйных выбухаў, але яна ўсё ж эвалюцыяніравала ў напрамку постіндустрыяльнага грамадства, падпарадкаваўшы вытворчасць «чалавеку спажываючаму». Узяць работы Ф. Рузвельта і яго каманды перыяду 30-х гадоў ды замяніць прозвішча Рузвельт на К. Маркс—і не кожны з нас зразумее, што яго падманулі. У канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў паўстала пытанне аб існаванні капіталізму як грамадска - эканамічнай сістэмы. Вымушаны лічыцца з неабходнасцю забяспечыць большасці высокі ўзровень жыцця, Захад здолеў перамагчы цыклічнасць свайго развіцця, знайшоў сродкі ад крызісаў, утаймаваў агрэсіўнасць капіталу ў яго барацьбе за экстэнсіўнае расшырэнне рынкаў збыту. На здзіўленне нам, асноўнай умовай далейшага прыгнёту там зрабіўся сацыяльны свет і «найбольш поўнае задавальненне ўзрастаючых патрэб працоўных».

Галандскі прафесар Цінбергін у свой час сфармуляваў пяць галоўных мэт грамадства, якія былі прыняты на Захадзе. Гэта, па-першае, захаванне міжнароднага міру, па-другое, максімальны выпуск прадукцыі на душу насельніцтва пры поўнай занятасці і раўнавазе грашовай сістэмы, па-трэцяе, палярызаванне размеркавання грамадскага прадукту паміж сацыяльнымі групамі і асобнымі краінамі, па-чацвёртае, эмансіпацыя груп, якія не карыстаюцца раўнапраўем; па-пятае, як мага большая індывідуальная свабода. У 1969 годзе Я. Цінбергін атрымаў Нобелеўскую прэмію, трэба думаць, не за сацыяльную утопію.

Многія ў нас ставяць знак роўнасці паміж рынкам і капіталізмам, рынкам і Заходняй Еўропай. Але шматукладнасць эканомікі ў спалучэнні з рынкам існуе не адно дзесяцігоддзе, а ўжо некалькі стагоддзяў, і нараджалі яны самыя розныя формы грамадскага ладу.

Моднай стала цяпер ідэя самаразвіцця грамадства, і, у прыватнасці, эканомікі. На думку многіх нашых прадпрымальных людзей, дастаткова ўвесці рыначныя адносіны, прыкласці да іх разнастайнасць форм і відаў уласнасці —і ўсё атрымаецца «само собой». Ідэя зразумелая: плюнуць на ўсё, абагаціцца, карыстаючыся неразбярыхай, а там —хоць трава не расці. Для багатага месца на Захадзе заўсёды хопіць.

Але свет да XXI стагоддзя стаў ужо іншым. Сёння ў ім няма тых мільянераў, якія былі на пачатку XX стагоддзя. Канцэнтрацыя вялікіх сум у адных руках бывае вельмі рэдкай, і то на вельмі кароткі прамежак часу. Гэтыя грошы пастаянна знаходзяцца ў абарачэнні і служаць усяму грамадству.

«Чырвоныя» і «белыя», «левыя» і «правыя» павінны ўсвядоміць, што марксізм - ленінізм застаўся ў гісторыі як класіка, да якой належыць адносіцца з павагай, але разумеючы, што гэта — у мінулым. За межамі марксізму-ленінізму — усё XX стагоддзе. Свет у многім ужо іншы, і аналізаваць яго з дапамогай Маркса немагчыма. У кожным грамадстве і на кожным этапе яго развіцця ёсць «камуністычнае» і «капіталістычнае», і яны суіснуюць. Магістральнае развіццё чалавецтва ідзе па іншых напрамках: ад патрыярхальнага да аграрнага, аграрна - індустрыяльнага, індустрыяльнага і постіндустрыяльнага.

Сёння тыя, хто вядзе спрэчкі аб «сацыялізме» і «капіталізме», вельмі шкодзяць развіццю грамадства. Гэта пытанне — пытанне ўлады. Не больш. Наш дагматызм прывёў ужо да таго, што мы ў канцы саракавых — пачатку 50-х «прагледзелі» момант, калі развітыя краіны свету перайшлі ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага грамадства. Неабходна ўжо сёння пачаць культывацыю фрагментаў постіндустрыяльнай культуры. Таму што дагнаць Захад на індустрыяльным этапе немагчыма.

У XXI стагоддзі мы павінны зрабіць скачок шляхам канцэнтрацыі матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў на стратэгічных напрамках у сферы высокіх тэхналогій. Тэхналогій заўтрашняга дня. Гэтым шляхам пайшла адсталая, бедная прыроднымі рэсурсамі Японія — вынік наяве. Хто сёння можа з упэўненасцю гаварыць аб пабудаваным у Японіі грамадска-эканамічным ладзе як аб «сацыялізме» або «капіталізме»? Ніхто. Таму што гэта ні тое ні іншае — гэта постіндустрыяльнае грамадскае ўстройства.

Я далёкі ад таго, каб браць Японію за ўзор дзяржаўнага будаўніцтва. Трэба шукаць свой, паралельны шлях у постіндустрыяльнае грамадства. Не атрымаецца ў нас ні японскага, ні германскага, ні шведскага ўзору рыначных адносін. А мы ўсё глядзім у бок Захаду і спрабуем перанесці іх вопыт на нашу глебу, на якой ён не прыжывецца. Глядзець у іх бок — значыць, глядзець ім у спіну, а гэта ў сваю чаргу азначае, як кажуць шафёры, увесь час глытаць пыл.

Многія дзесяцігоддзі мы плявалі ў калодзеж, абвяргаючы буржуазную сацыялогію. Сваю ж навуку не стварылі. Ці не прыйдзецца цяпер вадзіцы напіцца? Ва ўсякім разе, настаў час задумацца аб выбары. Не, не заходняга ўзору, не «мадэлі» — аб выбары арыенціраў. Ад гэтага залежыць, які спосаб прыватызацыі браць на ўзбраенне, як будаваць падатковую палітыку, каму і як дапамагаць крэдытамі. Ад гэтага залежаць і тэмпы нашай рэформы, і яе вынікі, і тое, да чаго мы прыйдзем.

Ю. КЛІНЦОЎ,
гісторык, прыхільнік ідэі стварэння партыі народнай згоды.

СПАВЯДАЛЬНЯ

«УСЁ НАША МАТЭРЫЯЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ НЕ ВАРТАЕ АДНОЙ ДУШЫ»

Цяпер стала модным насіць крыжык. І ўсім гаварыць, што ты верыш у Бога. А яшчэ хваліцца абразком у сваім пакоі і тым, што ў мінулым годзе два разы з кампаніяй схадзіў у царкву.

Алена Богдан сапраўды верыць у Бога. А яшчэ ў чалавечую міласэрнасць. Алена сама яе стварае. Сваімі рукамі і сэрцам. Яна — сястра міласэрнасці Праваслаўнага таварыства міласэрнасці пад заступніцтвам Святой Сафіі Слуцкай.

— Алена, у вас «самая» маладосць. Абсалютная большасць вашых равеснікаў выбірае зусім іншае жыццё. Вы маеце вышэйшую адукацыю, добрую работу, перспектывы і... Чаму?

— Сястра міласэрнасці — гэта бясплатная праца ў час, свабодны ад асноўнай працы. Так што вышэйшая адукацыя, работа — усё засталося. Што ж датычыцца перспектыў... Я знайшла сваю самую галоўную перспектыву — Бога ў сваёй душы.

Ведаеце, ахрысцілі мяне толькі тры гады назад. Бацькі ўспрынялі маю працу ў бальніцы складана. Яны перажывалі і перажываюць за мяне. За тое, што стамляюся. За тое, што часта не абедаю дома. Яны пратэставалі, даказвалі, што дзяржава павінна вырашаць свае праблемы, у тым ліку і праблемы аховы здароўя сваіх грамадзян, сама, уласнымі сіламі, а не рабіць гэта за кошт добрых і наіўных дзяўчынак. Я слухала. Разумеюце, гэта маё жыццё — ісці з добрымі намерамі і канкрэтнай дапамогай да людзей, якім яна сапраўды патрэбна.

— Сястра міласэрнасці — гэта шмат цяжкай і брудная работы, але я не бачу ў вас нейкай фізічнай звышсілы.

— Так, я не скажу, што гэта лёгка. Усё вельмі канкрэтна. Высакароднымі словамі аб любві да бліжняга могуць рассыпацца ўсе. Сястра міласэрнасці — гэта і паднесці судна хвораму, і перакласці яго на другі бок, і прыбраць за ім, і яшчэ шмат такога, якое пры адным пералічэнні ў большасці выклікае пачуццё грэблівасці. У мяне ж з першых дзён узнікала да хворага пачуццё шкадавання, і быў страх, як бы яму не пашкодзіць, не зрабіць балюча. Дапамагло адчуванне, што цела Госпада таксама было з крыві і касцей. І што яно таксама пакутавала і прасіла аб дапамозе.

У Царства Нябеснае вядзе вузкі шлях. Усіх жадаючых трапіць туды можна ўмоўна раздзяліць на тры катэгорыі. Першая — раб, які робіць з-за страху, што яго пакараюць. Другая — наёмнік, які працуе з-за грошай. І трэцяя — свабодны чалавек, які жыве і дапамагае людзям з-за любві да іх. Я інакш жыць не магу. Мне ўзнагароды ці аплата ў нейкім іншым выглядзе не патрэбны. Гэта не словы. Гэта ўнутранае перакананне.

— Але ж гэта такі крыж. Я пабываў у моргу і дагэтуль у сэрцы сядзіць згустак чалавечага болю.

— У каго сапраўды крыж, дык гэта ў сваякоў і блізкіх хворага.

— Але яны перажываюць толькі за аднаго свайго роднага чалавека. А вы перажываеце, хочаце вы гэтага ці не, за ўсіх хворых, з якімі сутыкаецеся.

— Спачатку я не магла знаходзіцца ў бальнічнай палаце і дзвюх гадзін. Страшна, цяжка і імгненна стамляешся, не столькі фізічна, колькі маральна. Асабліва было нялёгка, калі працавалі ў дзіцячым гематалагічным цэнтры. Там часта паміралі дзеці. Што можа быць страшней? Сілы дае Бог. Калі стаіш у царкве, і ад усяго сэрца звяртаешся да Усявышняга, ледзь не фізічна адчуваеш, як да цябе прыходзяць сілы, і ты гатовы ісці зноў у бальніцу, на работу, усюды, дзе патрэбна твая дапамога.

— Гэта дапамога, напэўна, не толькі фізічнага плану. Вы нясеце духоўную падтрымку людзям.

— У многіх выпадках яна бывае больш значнай, чым фізічная. І гэта радуе. І абнадзейвае. Хоць, вядома, нас адразу не вельмі цёпла ўспрымаў нават медперсанал бальніц, дзе мы працавалі. А святара, які прыходзіў да хворых, нават, здаралася, зневажалі, называлі яго і нас цемрашалямі. Тады яшчэ не быў прыняты Закон аб свабодзе сумлення.

Цяпер атмасфера значна змянілася. Нам вераць. Многія пачынаюць шукаць свой зварот да Бога, да сваёй зацкаванай матэрыяльным жыццём душы. Ужо ёсць выпадкі, калі ўрачы перад аперацыяй шчыра моляцца.. Нават у самым закаснелым чалавеку хаваецца шмат добрага, душэўнага, сапраўднага. Для адных дастаткова адной размовы, для другіх шлях да сваёй душы расцягваецца на ўсё астатняе жыццё. А некаторыя так і не здважваюцца яго шукаць. Гэта страшна.

— Алена, а на якім адрэзку свайго шляху стаіце вы самі?

— Мне цяжка адказаць, як далёка я прайшла па дарозе да свайго храма. Магу сказаць, што ўсе мы, сёстры міласэрнасці, прыйшлі з аднаго свету, з аднаго савецкага асяроддзя. І я ў свой час слухала «Пінк Флойд», Цоя і іншыя рок-гурты і жыла тым жа жыццём, якім жыве звычайная дзяўчына. Але заўсёды адчувала, што гэтага недастаткова. Што ўвогуле не хочацца так жыць. А цяпер, прынамсі, я адчуваю, што іду па сваім шляху. Я не стаю на месцы. Як не стаіць на месцы і мая душа.

— А ў тых, хто слухае Цоя, яна не развіваецца?

— Я паважаю Віктара Цоя, як спевака. Як чалавека. Але я ўпэўнена, што яго музыка не нясе гармоніі духу. Асабіста мяне Цой цяпер абцяжарвае.

Яго песні, на мой погляд, даюць гарызантальнае развіццё, упіваніе сваімі пачуццямі і эмоцыямі. У лепшым выпадку, такая музыка выклікае гатоўнасць да перажывання. Але калі сур'ёзна ставіцца да сябе, сучасныя песні ў сваёй большасці духоўнага развіцця не даюць. Вертыкальнае развіццё — гэта адносіны з Айцом Нябесным. Вышэйшая музыка — гэта малітва, спроба ачышчэння ад чалавечай брыдоты.

— Ці адчуваеце сябе рознымі людзьмі ва ўборы сястры міласэрнасці і ў звычайным адзенні?

— Убор сястры міласэрнасці — гэта большая ступень адказнасці. За мной—твар Царквы. І страціць тут нешта — нельга.

— Мне вядома, што вы ўпрыгожваеце аблічча Царквы і сваім настаўніцтвам у нядзельнай праваслаўнай школе.

— Упрыгожваеце — гэта занадта моцна. Мне, як кажуць у такіх выпадках, даручылі несці слова Божае да дзяцей, спрабаваць ім растлумачыць глыбіню хрысціянскага пачуцця ісціны і радасць зносін з Богам.

— Да ўсіх даходзіць?

— Цяпер вельмі складаныя дзеці. У нашым грамадстве няма месца Богу. Мы не паважаем адзін аднаго. Усё гэта адбіваецца на дзецях, ад якіх патрабуем потым сцятасці. Ім вельмі цяжка даецца вучэнне пра Бога. Але я адчуваю: большасць малых Чалавекаў ужо зразумела на ўсё астатняе жыццё, што грэх—гэта набліжэнне да самага страшнага, што можа адбыцца ў чалавечым жыцці,—духоўнага спусташэння і падзення.

Згадзіцеся, у самым пачатку свайго шляху ўсвядоміць гэта вельмі важна.

— Вы самі пачалі гэта разумець, паводле вашых слоў, толькі тры гады назад. Напэўна, усё роўна недзе, у падсвядомасці, цягне да мінулага жыцця з усімі яго грэшнымі бакамі? Няўжо не прыходзіць жаданне стаць зноў такой, як усе? Не «загібацца» на дзвюх работах, не кідаць сябе ў топку чалавечага болю і пакут?

— Усё старое адыходзіць з болем. Гэта трэба прыняць. У свой час я не баялася адыходзіць ад старых каштоўнасцей. Праз нейкі час я ўжо не магла інакш думаць, жыць, гаварыць. Быў вялікі перыяд адыходу ад усіх. Калі хтосьці спрабаваў перашкаджаць ці ўгаворваць, спрабавала растлумачыць «чаму?» і ішла далей. У свой час я займалася ўсходнімі рэлігіямі, але душа не прыняла гэтага. Не адчувалася паўнаты быцця. У праваслаўнай царкве зразумела тое, што шукала ўсё жыццё. І тады, калі прыйшла да Веры, амаль адразу ўзнікла вялікае пытанне да ўсіх: «Як вы не разумееце, што ў вас з Хрыстом будзе зусім іншае жыццё? Свет такі прыгожы і глыбокі. Трэба палюбіць адзін аднаго да аднадумнасці. Ідзі да сваёй душы і памятай, што табе дапамогуць».

— Алена, але ўсё ж, вы не лічыце, што з набыццём новага і цудоўнага нешта адначасова і страчваецца?

— А што я страчваю? Тэту мітусню, прабачце, каля карыта? Калі ў чалавека існуе толькі некалькі жывёльных жаданняў і інстынктаў? Не ведаю. У мяне такое ўражанне, што тыя, хто не далучыўся хоць нечым да Бога, да царквы, проста спяць. Усё наша матэрыяльнае асяроддзе не вартае адной душы.

Вагон мінскага метро. Я гляджу на кажэтліва выкінуты паверх моднай курткі крыжык дзяўчынкі-пятнаццацігодкі, на яе не менш модную сукенку, на маладыя, здаровыя, прыгожыя сківіцы, якія рытмічна жуюць пахучую гумку і не магу ўбачыць яе вочы. Вочы, безумоўна, ёсць. І пэўны колер у іх ёсць. Але яны пус-ты-я.

Я не супраць модных сукенак і гумак. Быццам бы ўсе мы любім пажаваць і панасіць моднае і прыгожае. Але калі ў пятнаццаць вочы нічога не хочуць бачыць акрамя відэаролікаў, камісійных крам, імпартных цыгарэт і мясцовых плэйбояў, становіцца неяк страшнавата за гэтыя вочы, гэтую дзяўчыну, за тое самае, што мы спрабуем назваць новым, ці свабодным, жыццём.

Можа, я памыляюся. Можа, гэтае ўражанне не вельмі дакладнае і занадта экспрэсіўнае. Можа быць. Ва ўсякім выпадку, хацелася б у гэта верыць.

Новае пакаленне выбірае... А што выбірае новае пакаленне? І каму сёння да гэтага ёсць справа?

Алена выбрала Бога. Я не лічу сябе надта веруючым чалавекам, але ўсю нашу размову мне прыемна было глядзець у вочы гэтага чалавека.

Аляксандр КОКТЫШ.

Лідэр маладых палітыкаў рэспублікі Анатоль ЛЕБЯДЗЬКО:

«Ёсць справы больш неадкладныя, чым рэферэндум»

Пасля невялікага зацішша, звязанага з шокам ад лібералізацыі цэн, палітычнае жыццё ў рэспубліцы зноў закіпае. Бяссілле перад астранамічнымі цэнамі змяшалася з трывожным чаканнем паўтору «рабочага красавіка». Што будзе заўтра? Прагнозы супярэчлівыя. І ўсё ж паспрабуем. Сёння наш субяседнік —народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Анатоль ЛЕБЯДЗЬКО.

— Па дарозе ў Вярхоўны Савет паслухаў мітынгуючых на плошчы Незалежнасці людзей. Прызнаюся, быў крыху здзіўлены такім рэзкім непастаянствам палітычных сімпатый. Дэпутатаў-дэмакратаў крытыкуюць не менш эмацыянальна, чым яшчэ ўчора лаялі дэпутатаў-камуністаў. Анатоль, няўжо наш парламент так хутка «палявеў»?

— Сапраўды, усё больш людзей віну за імклівы крах эканомікі адносяць на рахунак дэмакратаў. Да нас падобныя настрої прыйшлі з Расіі і адразу ж былі ўзняты на шчыт былой наменклатурай. Але вось дэталь: у адрозненне ад расіян у Беларусі дэмакраты рэальнай улады яшчэ і не нюхалі. Кіруюць намі, як і раней, наменклатуршчыкі, толькі цяпер без партбілетаў у кішэнях. Рэформы яны зацягваюць наўмысна, а абуранаму абывацелю растлумачваюць, што калі КПБ афіцыяльна рэспублікай ужо не кіруе, значыць вінаватыя ва ўсім «гэтыя, з бела-чырвона-белымі сцягамі». Схема, канешне, не новая, але эфектыўная. Народ пачынае падазрона ставіцца да новых палітыкаў, а «былым» жа нічога іншага і жадаць не трэба.

Што датычыць Вярхоўнага Савета, дык эпітэтаў тут заўсёды было зашмат. Ніякіх ілюзій наконт яго саставу я не маю, нават калі нехта раптам і «палявее». Рэальная раскладка ранейшая. Агульная колькасць блока «правых сіл» — каля ста дэпутатаў. Найбольш арганізаваная сіла, што яму процістаіць — апазіцыя БНФ «Адраджэньне». Яна нешматлікая (каля 30 парламентарыяў), але тактыка яе дзейнасці даволі гібкая і эфектыўная.

Я спецыяльна засяроджваю ўвагу на колькасных суадносінах сіл паміж дзвюма найбольш радыкальнымі групоўкамі. Раблю гэта па наступных прычынах. Па-першае, каб стала зразумелым: дэмакраты Беларусі пакуль гэтак жа далёка ад руля ўлады, як нашы падаткі — ад рыначных адносін. І другое. Палітычныя вятры ў нашым парламенце такія зменлівыя, што яго па праву можна назваць самым непрадбачлівым.

Прычына — адсутнасць арганізаванага цэнтрысцкага блока. Каля 170 дэпутатаў з гонарам называюць сябе «незалежнымі» і ні да якіх іншых фракцый не належаць. А значыць, прадказаць, якую пазіцыю яны зоймуць па тым ці іншым пытанні, проста немагчыма. Адсюль і «парадаксальныя» рашэнні: то з пенай на губах яны ваююць з нацыянальнай сімволікай, то аднадушна за яе галасуюць і г. д.

У свой час некаторыя дэпутаты спрабавалі стварыць магутны цэнтр. За гэта выступалі, у прыватнасці, Ганчар, Карпенка, Булахаў, але, на жаль, ідэя, якая мела ўсе падставы для поспеху, па шэрагу прычын правалілася. Цэнтрысцкая «ніша» доўга пуставала. Цяпер свае прэтэнзіі на яе заявіла дэпутацкая група «Беларусь». Аб'яднанне гэтае ў парламенце новае і ўяўляе сабой нейкі сімбіёз цэнтрыстаў з былымі камуністамі. Калі «Беларусь» здолее стаць сапраўднай фракцыяй, г. зн. жорстка цэнтралізаванай структурай, можна чакаць, што менавіта яна будзе вызначаць палітыку Вярхоўнага Савета.

Дзеля аб'ектыўнасці: у недалёкай будучыні яна (палітыка) сур'ёзна не зменіцца. Цяперашні састаў парламента і нават два-тры наступныя наўрад ці змогуць істотна змяніць жыццё рэспублікі. Гэта пад сілу толькі прафесіянальным палітыкам. А іх у нас фактычна няма.

Пакуль жа можна толькі спадзявацца на лепшае. Пераход да рынку — гэта як скальпель у руках хірурга: дзе ні рэж — балюча. Выратоўваеш эканоміку — стогнуць бюджэтнікі. І наадварот. Патрэбны ўмелыя «хірургі» з дзяржаўным мысленнем...

— Магчыма, знайсці іх дапаможа маючы адбыцца рэферэндум, калі ён, канешне, адбудзецца?

— Думаю, адбудзецца. Іншае пытанне — якую карысць прынясе? Скажам, пойдзе ў адстаўку ўрад Кебіча, будзе распушчаны Вярхоўны Савет. Ну, а далей што? Хто дасць гарантыі, што вызваленых крэслы зоймуць сапраўдныя дэмакраты і сапраўдныя прафесіяналы? Палітычная палітра рэспублікі вельмі бедная. На пачатак гэтага года на Беларусі было зарэгістравана толькі пяць партый. Гэта — Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Беларуская сялянская партыя, Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць і Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі. На жаль, пакуль яны вельмі нешматлікія. Для росту радоў у гэтых партый проста няма сацыяльнай базы. Каля васямісот фермераў і некалькі дзесяткаў тысяч людзей, маючых уласную справу, біржавікоў — кропля ў моры люмпенаў ад неабальшавізму. Таму няварта здзіўляцца, што фракцыя Грамады ў Вярхоўным Савеце складаецца з 13 дэпутатаў, 2 прадстаўнікі ёсць у АДПБ і толькі адзін — у сялянскай партыі. Гэтыя паказчыкі рэальна адлюстроўваюць нашу рэчаіснасць і наўрад ці яны зменяцца пасля рэферэндуму і новых выбараў.

Апазіцыя гэта разумее. Адсюль і прапанова «аб партыйных спісах», якая вельмі нагадвае камуністычныя «квоты» былога з'езда народных дэпутатаў былога СССР. Сумна, але, нават паводле самых аптымістычных прагнозаў сацыёлагаў, за дэмакратаў на перыферыі прагаласуе не больш за 7 працэнтаў выбаршчыкаў, а гэта значыць, што «правінцыя» дасць у новы парламент пераважна «неабальшавікоў». У той жа час аддаць астатнія 80 месцаў функцыянерам няхай і новых, але пакуль не стаўшых сапраўды масавымі партый, мякка кажучы, недэмакратычна. Нават з меркаваннямі элементарнай арыфметыкі: палавіну дэпутатаў выбірае насельніцтва ўсёй рэспублікі, другую — некалькі тысяч выбраных.

Безумоўна, пагроза прадзядзення рэферэндуму падгоніць Вярхоўны Савет, прымусіць яго працаваць больш эфектыўна, аднак ці надоўга? І ці такой цаной гэта павінна дасягацца? Бо ўжо цяпер відавочна, што працэс падрыхтоўкі рэферэндуму выйшаў з-пад кантролю аўтараў гэтага праекта. Вынікі могуць быць самымі непрадказальнымі...

— Значыць, вы лічыце, што ў дэмакратаў няма шанцаў перамагчы?

— Ёсць, канешне. Гэтага шанцу няма ў выбаршчыкаў. Для іх выбары па прапанаванай схеме — палітычная рулетка.

Скажам, усе новыя партыі прафронтаўскай арыентацыі аб'яднаюцца на этапе выбараў супраць неакамуністаў і атрымаюць у парламенце большасць. Але ж на ўсіх міністэрскіх партфеляў не хопіць. Сёй-той з пераможцаў зноў апынецца ў апазіцыі. Зноў процістаянне, ад якога «жыццё не стане весялейшым».

— Атрымліваецца, куды ні кінь — усюды клін?

— Аднак які б рэзананс гэта ні выклікала, перакананы: цяпер ёсць рэчы намнога больш важныя і значныя за мяркуемы рэферэндум.

— Напрыклад?

— Увядзенне ў рэспубліцы прэзідэнцкай формы кіравання. Маю прапанову ўнесці гэтае пытанне на парадак дня заблакіравалі і «левыя», і «правыя». Прычына відавочная: першыя разумеюць, што не змогуць канкураваць з Шушкевічам, другія баяцца ўмацавання яго ўлады.

На мой жа погляд, прэзідэнт рэспублікі архінеабходны. Папершае, як фігура, здольная аб'яднаць вакол сябе палітычныя сілы, знізіць вастрыню процістаяння. Украіна таму выдатны прыклад. Па-другое, палепшыць гібкасць і аператыўнасць палітычнага і эканамічнага кіравання. Саветам даўно ўжо трэба ставіць помнік, з хутка стварыць новыя структуры ўлады якраз пад сілу толькі прэзідэнцкаму інстытуту.

І трэцяе. Вырасце наш рэйтынг на Захадзе. Таго ж Шушкевіча. Сёння тым яго ўспрымаюць як спікера парламента, і не больш. Прэзідэнт жа выбраны народам, а значыць — персона нумар адзін. І для замежжа, і для рэспублікі.

— Наколькі мне вядома, самі вы ўжо маеце подобны тытул — з'яўляецеся прэзідэнтам Асацыяцыі маладых палітычных дзеячаў РБ. Чым будзе займацца асацыяцыя?

— Галоўныя мэты дзве. Перш за ўсё — выхаванне ў палітыцы. Пакуль, на жаль, там у нас дамінуе ўзбуджэнне, якое, паводле слоў вядомага рускага палітыка Струве, абавязкова прыводзіць да рэакцыі. Стачкі, забастоўкі, стыхійныя мітынгі, акцыі непадпарадкавання — усё гэта ўзбуджэнне. Эмоцыі сціхаюць, вынік нулявы. Таму патрэбны элементарны палітычны лікбез.

Другая наша мэта — пошук і падрыхтоўка новых палітычных дзеячаў. Перш за ўсё маладых. Мы хочам дапамагчы ім стаць прафесіяналамі цяпер, а не праз 20 гадоў, калі настане час стаць на чале кіруючых структур.

— Дзякуй за гутарку. Жадаю поспехаў.

Гутарыў
Аляксандр ТАМКОВІЧ.

РОЗГАДАЕ РАЗГАДАЕ

У ПРЭЗІДЫУМЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

СТВАРАЕЦЦА АКАДЭМІЯ МІЛІЦЫІ

У Доме ўрада пад старшынствам В. Ф. Кебіча адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Асноўным пунктам парадку дня было пытанне «Аб рабоце органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь». З дакладам па ім выступіў міністр унутраных спраў У. Д. Ягораў.

Удзельнікі пасяджэння выказалі глыбокую трывогу з прычыны ўскладнення крымінагеннай абстаноўкі ў рэспубліцы. Так, у 1991 годзе працягваўся рост злачыннасці, якая ў абсалютных паказчыках павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 7,5 працэнта. Узраслі цынізм і жорсткасць злачынстваў, часцей пачала выкарыстоўвацца агнястрэльная зброя, усё шырэй распаўсюджваецца наркаманія. Вялікую занепакоенасць выклікае тэндэнцыя да павелічэння рэцыдыўнай і групавой злачыннасці. Не ўдаецца стабілізаваць і рост крадзяжоў. Пры гэтым асабліва негатыўны рэзананс у насельніцтва выклікаюць крадзяжы з кватэр, страты ад якіх летась склалі 40 мільёнаў рублёў.

Разам з тым у мінулым годзе на 6,3 працэнта скараціліся тэмпы росту злачынасці, зменшылася колькасць найбольш цяжкіх злачынстваў, у тым ліку забойстваў і замахаў на іх—на 10,8, разбойных нападаў — на 5,9, згвалтаванняў — на 7,8 працэнта. Раскрывальнасць злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку склала 74,8 працэнта, абясшкоджана больш за 15 тысяч асоб, што ўваходзілі ў злачынныя групы. Колькасць раскрытых крадзяжоў у буйных і асабліва буйных памерах узрасла на 11,8 працэнта, у бюджэт рэспублікі вернута больш за 100 мільёнаў рублёў.

Тым не менш Старшыня Савета Міністраў Беларусі В. Ф. Кебіч прапанаваў ацаніць дзейнасць рэспубліканскай міліцыі як яўна недастатковую. Быў унесены шэраг канкрэтных прапаноў па актывізацыі барацьбы са злачыннасцю. Звернута ўвага на неабходнасць узмацнення патрульнай службы, асабліва ў начны час, паляпшэння матэрыяльнай зацікаўленасці сяржанцкага саставу міліцыі, які непасрэдна сутыкаецца з крымінальнымі элементамі. Кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў заклікана больш актыўна выкарыстоўваць багаты вопыт паліцыі развітых краін Захаду.

Па выніках абмеркавання былі прыняты адпаведныя пастановы. У іх, у прыватнасці, прадугледжаны пэўныя структурныя пераўтварэнні ў органах Міністэрства ўнутраных спраў. Запланавана 15-працэнтнае скарачэнне іх кіруючага саставу і за кошт гэтага — умацаванне аператыўнага звяна міліцыі. З мэтай паляпшэння падрыхтоўкі кадраў вырашана стварыць на базе Мінскай вышэйшай школы МУС, Мінскай спецыяльнай сярэдняй школы міліцыі і Магілёўскай спецыяльнай сярэдняй школы транспартнай міліцыі Акадэмію міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, а на базе Навучальнага цэнтра пажаркай аховы МУС Беларусі — Вышэйшае пажарна-тэхнічнае вучылішча гэтага міністэрства. Прынята рашэнне аб стварэнні падраздзялення міліцыі па ахове дыпламатычных і консульскіх прадстаўніцтваў у Рэспубліцы Беларусь. Перагледжаны ў бок павелічэння нормы сутачнага забеспячэння асуджаных да пазбаўлення волі, а таксама асоб, якія знаходзяцца ў следчых ізалятарах, лячэбна-працоўных і выхаваўча-працоўных прафілакторыях Міністэрства ўнутраных спраў.

На пасяджэнні разгледжаны і іншыя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі.

ТАЙМ-АУТ

«Пахаванне» абяцаюць зрабіць пышным

28—29 сакавіка ў Маскоўскім палацы спорту ў Лужніках пройдзе турнір па спартыўнай гімнастыцы «Зоркі свету». Гэта апошнія спаборніцтвы, якія праводзіць Федэрацыя спартыўнай гімнастыкі былога СССР. Свае паўнамоцтвы яна перадае федэрацыям незалежных дзяржаў.

«Пахаванне» з шыкам уэяліся правесці спонсары — кампанія «Паліарт» і фірма «Саўінтэрінфарм», якія выдаткавалі на правядзенне спаборніцтваў 2,5 мільёна рублёў.

Лепшыя гімнасты свету разыграюць 12 камплектаў медалёў, пераможцаў чакае таксама і грашовая плата.

У турніры выступяць мацнейшыя гімнасты СНД: абсалютны чэмпіён свету-91 Г. Місюцін (Луганск), В. Шчэрба (Мінск), С. Харкоў, А. Варапаеў (абодва — Масква), А. Калываноў (Варонеж), Р. Шарыпаў (Харкаў). Апошнія чацвёра будуць змагацца за месца, якое дае права на ўдзел у першынстве свету, што адбудзецца ў Парыжы ў красавіку гэтага года. Місюцін, Шчэрба, Карабчынскі і Беленькі ўжо забяспечылі сабе гэтае права, як чэмпіёны 1991 года.

З жанчын у Парыж паедуць С. Багінская (Мінск), А. Чусавіцына (Ташкент), Т. Гуцу (Адэса) і Т. Лысенка з Херсона. Усе яны будуць удзельнічаць у спаборніцтвах «Зоркі свету» ў Маскве.

Арганізатары турніра разлічваюць, што ў турніры прымуць удзел гімнасты амаль з 30 краін. І яшчэ адна акалічнасць — школьнікаў на гэтыя спаборніцтвы будуць пускаць бясплатна.

І ПА ГРОШЫ, І ПА ГАРЭЛКУ

АСІПОВІЧЫ (І. Сцялура). Чэргі ў горадзе ў гэтыя дні вельмі вялікія. Куды б вы думалі? У ашчадныя касы. Работнікі завода агрэгатаў, кардонна-рубероідпаднага не могуць атрымаць сваёй заработнай платы за люты. Чаргу ў касу яны займаюць а сёмай гадзіне раніцы, каб атрымаць тыя 500 рублёў, якія выдаюцца аднаму чалавеку на рукі ў дзень. А калі ў цябе заработак 4—5 тысяч, то ў чаргу трэба стаць 7—8 разоў. А грошай усё роўна не хапае. І, здаецца, Асіповіцкі гарвыканком знайшоў правільнае вырашэнне гэтай праблемы. Ва ўсіх магазінах горада з 19 сакавіка гарэлка, віно, цыгарэты прадаюцца без талонаў. Чэргі ў ашчадных кас адразу ж перакінуліся да прылаўкаў вінна-гарэлачных аддзелаў. Праўда, а'явіліся грошы ў ашчадных касах.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

«Ад Савецкага інфармбюро»...

Агляд апошніх навін замежнага радыёэфіру прынёс разам з чакаемымі зменамі і пэўныя сюрпрызы. Яшчэ ў снежні ў праграмах «Голасу Амерыкі» паведамлялася, што праз месяцдва адбудзецца істотнае змяншэнне колькасці гадзін рускай службы рэдакцыі. І вось перадачы на рускай мове пачалі з'яўляцца амаль у два разы радзей. Затое поўнай нечаканасцю стала скарачэнне вяшчання на краіны Балтыі (Літву, Латвію і Эстонію), у якіх «Голас Амерыкі» карыстаўся вялікай папулярнасцю. Апошнім ударам па «аматарах заходніх галасоў» з'явілася ліквідацыя амаль дзесятка службаў міжнароднага польскага вяшчання з Варшавы. Пакінуты толькі самыя неабходныя і каштоўныя для палітычнага ўплыву рэдакцыі — літоўская, руская, англійская і, адзначце, беларуская. Якія вынікі можна зрабіць з вышэйпрыведзеных фактаў?

Па-першае, скарачэнне службаў і рэдакцый заходніх радыёстанцый сведчыць аб недахопе грошай (і ў тых жа ЗША пачынаецца моцны эканамічны крызіс) і адначасовым прызнанні аб'ектыўнасці перадач радыёстанцый СНД.

Па-другое, пільную ўвагу да нашай рэспублікі, асабліва з боку Польшчы, можна расцэньваць як жаданне як мага глыбей уплываць на палітычныя працэсы, што адбываюцца ў Беларусі і, пры магчымасці, кантраляваць іх. І апошняе. Калі справа так пойдзе і далей, то праз два-тры гады нам нічога не застанецца, як настроіць свае «Радыётэхнікі» і «Акіяны» на маскоўскую хвалю і пачуць знаёмае «Ад савецкага інфармбюро...» Бо даведацца аб падзеях за мяжой больш не будзе адкуль.

Нашчадкі-экспрапрыятары

Вельмі недарэчная сітуацыя склалася ў Луганскім музеі гісторыі горада, створаным на базе музея «палкаводца» Клімента Варашылава. Нечакана сюды наведаліся сваякі легендарнага маршала — нявестка Надзея Іванаўна і ўнук Уладзімір Пятровіч. У пераліку дарагіх іх памяці рэчаў Варашылава апынуліся ў першую чаргу не пісьмы, дакументы і дзённікі, а кітайская сярэбраная салатніца XVI стагоддзя, малахітавая скарбонка, залаты партсігар і падобныя рэліквіі. Аднак нашчадкі «самага трапнага рэвалюцыйнага героя» былі затрыманы музейнай аховай. Цікава, але вышэйназваныя рэчы юрыдычна належалі сям'і Варашылава і былі здадзены ў музей добраахвотна, таму ў выпадку суда нявестка і ўнук маюць неблагія шанцы выйграць працэс. Не выключана, што падобная гісторыя паўторыцца ў Беларусі. У музеях нашай рэспублікі таксама шмат каштоўных рэчаў, што належалі дзеячам дзяржавы і партыі, літаратуры і мастацтва і перададзены ў экспазіцыі добраахвотна ці нейкім іншым шляхам. Пакуль «экспрапрыятыя» каштоўнасцей у Беларусі нашчадкамі вялікіх людзей не адбываецца. Але ці не лепш загадзя прыняць адпаведныя меры?

Паміж двух Кітаяў

Як і чакалася, днямі Рыгу пакінулі дыпламаты Кітайскай Народнай Рэспублікі, незадаволеныя адкрыццём у Латвіі консульства іншай кітайскай рэспублікі — Тайваня. Разгадка простая.

Справа ў тым, што ва ўсім свеце краіны, якія не жадаюць сварыцца з кантынентальным Кітаем і адначасова мяркуюць супрацоўнічаць з Тайванем, падтрымліваюць адносіны з астраўной рэспублікай на ўзроўні місіі або гандлёвага прадстаўніцтва.

А вось міністэрства замежных спраў Латвіі вырашыла адкрыць у Рызе консульствы абедзвюх рэспублік, што і паслужыла прычынай адбыцця кітайскіх дыпламатаў. Дарэчы, «вялікі» Кітай не вельмі падтрымліваў імкненне Латвіі да незалежнасці.

ЕСЦЬ БЕЛАРУСКАЯ ПАШТОВАЯ МАРКА!

Мінская пошта ўпершыню паставіла штэмпель на першую беларускую паштовую марку. На чырвоным фоне змешчана каляровая выява крыжа Ефрасінні Полацкай — адной з галоўных нацыянальных каштоўнасцей, створаных у дванаццатым стагоддзі. Побач беларускі арнамент і лічба 1992.

Дарэчы, кошт маркі названы дакладна: 1.00. Але ў якіх адзінках — рублях, талерах ці нейкіх іншых, невядомых нам дагэтуль? Аддадзім належнае асцярожнасці нашай пошты!

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«КАНВЕРСУЕМЫ» ПЯТАК

У апошнія дні на Беларусі ўсё радзей у абарачэнні можна заўважыць пяцікапеечныя манеты. Адны бачаць у гэтай з'яве падкопы замежных разведслужбаў, другія адносяць знікненне пэўнай часткі «пятакоў» на рахунак айчыннай мафіі. Сапраўдныя прычыны выглядаюць, аднак, куды больш празаічна. Дзеля іх высвятлення спачатку перанясёмся ў «братнюю» Польшчу, з якой у Беларусі наладжаны трывалыя гандлёвыя зносіны на бытавым узроўні. Справа ў тым, што польскія гарадскія тэлефонныя аўтаматы працуюць пры дапамозе спецыяльных жэтонаў коштам у 16 тысяч злотых. Так бы палякі і трацілі свае тысячы, калі б зусім нядаўна адзін спрытнюга не заўважыў, што функцыю вышэйпамянёных жэтонаў выдатна выконваюць простыя савецкія пятакі. Даведаліся аб гэтым і іншыя нашы суайчыннікі. Пакуль хваля перакачкі пяцікапеечных манет у Польшчу не набыла масавага характару, але калі ўлічваць той факт, што амаль кожны пяты жыхар Беларусі наведвае суседнюю краіну, можна чакаць сапраўднага пяцікапеечнага «нашэсця». І нічога дзіўнага тут няма. У Беларусі цяпер за пятак нічога не купіш (раней можна было хоць у метро праканіцца). А ў Польшчы за кілаграм савецкіх пятакоў можна атрымаць каля 300 тысяч злотых, што пры абмене складзе прыкладна 30 амерыканскіх долараў. Такім чынам, і палякам выгадна, і мы зрабілі свой пятак канверсуемай валютай. Да ведама — у адным кілаграме наваяўленай «валюты» каля двухсот «пятакоў».

НАВОШТА ПІЎ?

У цікавы час мы з вамі жывём: крадуць усё запар, без разбору. Са сцяны дома № 92 па вуліцы Кабушкіна ўкралі... тэлефон-аўтамат. Злодзей пакуль не ўстаноўлены. А вось з кватэры рабочага ДПЗ-11, узламаўшы ўваходныя дзверы, выкралі... 2 бутэлькі гарэлкі. Праўда, дамушнік знойдзены і затрыманы. Ім аказаўся сусед пацярпеўшага. Вельмі ўжо моцна ён пакутаваў, калі адразу ж пасля крадзяжу знішчыў выкрадзенае шляхам... выпівання. Ушчэнт п'янага яго затрымаў участковы інспектар міліцыі Заводскага РАУС і даставіў па назначэнню.

ЯШЧЭ ПАГЛЯДЗІМ, ХТО КАГО

МАЛАРЫТА. Раённы суд апраўдаў міліцыянераў, якія збілі амерыканскага бізнесмена Уладзіміра Байчука. Але, відаць, справа на гэтым не скончыцца: пракуратура вобласці і адвакат пацярпеўшага маюць намер аспрэчваць рашэнне суда.

Па словах міліцыянераў (Сяргея Карнелюка і Ігара Тацэвіча), бізнесмен, будучы п'яным, сам на іх напаў. Амерыканец жа, быццам у ваду глядзеў, адразу ж пасля збівання прайшоў экспертызу, якая прызнала яго цвярозым. Аднак суд, як бачым, даў больш веры словам міліцыянераў.

ЗАКАХАНЫЯ, СЯБРУЙЦЕ З ВАХЦЁРАМІ!

На другі дзень вясны юны закаханы Н. вырашыў пабачыцца са сваёй дзяўчынай, якая жыла ў інтэрнаце. Паколькі пасля адзінаццаці вечара ўваход у яго забаронены, каханая спусціла наведвальніку з акна на трэцім паверсе звязаныя прасціны.

Але прасціны былі савецкай вытворчасці і не вытрымалі цяжару — юнак упаў, зламаўшы руку і траўміраваўшы грудную клетку. Відаць, дзяўчына паспяшалася да яго на дапамогу, але не звычайным шляхам — міма вахцёра, а зноў па прасцінах...

У выніку яна не дажыла нават да прыезду «хуткай». А расказаў гэтую жудасную гісторыю «Голас Украіны», паставіўшы над ёй загаловак: «Закаханыя, мяняйце прасціны!»

БелаПАН.

Хуліганы з газавымі балончыкамі

ГОМЕЛЬ (У. Пернікаў). Калі надвячоркам прахожыя мужчыны просяць кагосьці даць ім закурыць, або цікавяцца, каторая зараз гадзіна, людзі нярэдка апасаюцца ўступаць у гутарку. Чаму? Баяцца, што супраць іх прыменяць газавыя балончыкі і абрабуюць.

Менавіта ад гэтага пацярпелі выкладчык каапераціўнага інстытута і вадзіцель таксапарка. У першага сярод белага дня хуліган забраў джынсавую куртку, шалік і 1.570 рублёў, а другому пасажыр пырснуў з балончыка ў твар якраз у той момант, калі трэба было разлічвацца за праезд. Хулігана не знайшлі.

Футбол-92: ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА...

Менш чым праз месяц — 18 красавіка — пачнецца нацыянальны чэмпіянат Беларусі па футболу. Гэта будзе першы ў гісторыі рэспублікі паўнацэнны самастойны чэмпіянат, у якім прымуць удзел усе мацнейшыя на сённяшні дзень беларускія каманды.

З развалам былога Саюза ССР рушыцца, як вядома, і вялікі спорт. На самастойныя рэйкі пераходзяць не толькі нацыянальныя алімпійскія камітэты былых рэспублік СССР, а і асобныя віды спорту. Магчымасць паказаць сябе на еўрапейскай арэне атрымае неўзабаве і беларускі футбол...

Нашы чытачы, несумненна, ведаюць, як упарта і настойліва спрабавала белакаменная Масква ўтрымаць у сваіх руках гэты, як векалі, так і цяпер прывілеяваны від спорту... Колькі было гучных спрэчак (а яшчэ больш — закулісных здзелак і махінацый) наконт таго, каб «утрымаць» пад эгідай Федэрацыі футбола СНД Украіну, Беларусь, Казахстан і іншыя суверэнныя дзяржавы! Але дзякуючы ў асноўным намаганням спартыўных дзеячаў Украіны штучнае фарміраванне, толькі-толькі нарадзіўшыся, бясслаўна сышло з арэны. Еўрапейскі футбольны саюз, а ўслед за ім і Міжнародная федэрацыя футбола далі сваю згоду на афармленне былых рэспублік СССР у свае рады.

І тады паўстала яшчэ адно пытанне: а ці патрэбен чэмпіянат СНД? Зноў былі гарачыя, часам нават рэзкія спрэчкі... Больш таго, у кулуарах Федэрацыі футбола паспелі нават «распрацаваць» каляндар чэмпіяната 1992 года, у адпаведнасці з якім мінскім дынамаўцам, напрыклад, прадстаялі ваяжы не куды-небудзь, а ў Ташкент і Наманган, Сухумі і Уладзікаўказ, і яшчэ шмат куды, дзе сёння не тое што выйграць «не дазволяць», а нават не могуць і гарантаваць тваю бяспеку... І тут ужо свой голас падало кіраўніцтва нашага галоўнага футбольнага клуба. У канцы лютага, калі стала вядома аб ліквідацыі чэмпіяната СНД, дынамаўцы сталіцы Беларусі адмовіліся ад далейшага розыгрышу Кубка Садружнасці. Па-першае, у чвэрцьфінале ім прадстаяла правесці адзін толькі матч — у Душанбе з мясцовым «Памірам», а, па-другое, які сэнс усяго гэтага?! Заставацца лялькай у руках маскоўскіх футбольных босаў мінчане больш, на шчасце, не пажадалі...

А да таго часу плённа і, на нашу думку, даволі ўдала папрацавала Федэрацыя футбола Беларусі. Прадчуваючы развал першынства СНД, у футбольным штабе паралельна правялі прапрацоўку палажэння аб чэмпіянаце рэспублікі. Як расказаў прэзідэнт Федэрацыі Яўген Шунтаў, у гэтай рабоце ўлічваліся прапановы і пажаданні многіх спецыялістаў і трэнераў, нават радавых аматараў спорту. У некалькіх варыянтах прымаліся пад увагу фінансавыя паказчыкі беларускіх каманд, наяўнасць базы, прапановы мясцовых улад, пажаданні працоўных калектываў, гонар якіх і будуць абараняць удзельнікі рэспубліканскага чэмпіяната.

Як жа выглядае палажэнне аб першым нацыянальным чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па футболу?

У першай лізе выступяць шаснаццаць калектываў. Гэта: «Дынама» (Мінск), «Днепр» (Магілёў), «Дынама» (Брэст), КІМ (Віцебск), «Хімік» (Гродна), «Гомсельмаш» (Гомель), «Металург» (Маладзечна), «Тарпеда» (Магілёў), СКБ-«Лакаматыў» (Віцебск), «Тарпеда» (Мінск), «Шахцёр» (Салігорск), «Будаўнік» (Старыя Дарогі), «Трактар» (Бабруйск), БелАЗ (Жодзіна), «Абутнік» (Ліда) і «Ведрыч» (Рэчыца). Крыху больш чым за два месяцы — з 18 красавіка па 21 чэрвеня — яны выявяць у паядынках паміж сабой першага чэмпіёна суверэннай Беларусі. Гульні пройдуць у адзін круг, а гаспадароў выявілі па жараб'ёўцы, пры гэтым адны з каманд правядуць на сваім полі па 7 матчаў, а другія — па 8. Аднак, наколькі нам вядома, на такую акалічнасць ніхто не ў крыўдзе: галоўнае, як мяркуюць спецыялісты, надаць першынству баявы характар, зацікавіць гледачоў змястоўнай гульнёй, шчырай і сумленнай барацьбой за ўзнагароды...

Зроблены такім чынам «усечаны» варыянт мае на мэце яшчэ адну, несумненна, галоўную задуму. Ужо ў другой палавіне гэтага года беларускі нацыянальны чэмпіянат пройдзе на еўрапейскую сістэму — «восень—вясна». Што гэта азначае? Дзесьці восенню (дакладны тэрмін пакуль што не вызначаны, але не ў гэтым сутнасць справы) пачнецца чэмпіянат рэспублікі 1992—1993 гадоў. Робіцца гэта з адной мэтай: упісацца ў рамкі еўрапейскіх кубкавых турніраў з тым, каб ужо, пачынаючы з 1993 года, самастойная Беларусь змагла заявіць для ўдзелу ў розыгрышы Кубка чэмпіёнаў, Кубка ўладальнікаў кубкаў і Кубка УЕФА сваіх паўнамоцных прадстаўнікоў.

Тое ж, што да таго часу Федэрацыя футбола Беларусі будзе прызнана паўнапраўным членам УЕФА і ФІФА, сёння сумненняў ужо няма. У адпаведнасці з існуючым футбольным заканадаўствам, месяц назад у гэтыя міжнародныя футбольныя органы з Мінска накіраваны адпаведныя дакументы. З ліпеня яны будуць разгледжаны, Беларусь стане паўнапраўным членам сусветнага футбольнага грамадства. І, такім чынам, пачынаючы з 1993 года, мы зможам убачыць на стадыёнах нашых гарадоў матчы розыгрышаў еўрапейскіх кубкаў. А там, глядзіш, з'явіцца і магчымасць выступіць самастойнай камандзе Беларусі на чэмпіянатах свету і Еўропы...

А сёння лепшыя футбольныя калектывы (а гэта, прынамсі, не толькі пералічаныя вышэй 16 клубаў, а і 32 каманды другой і трэцяй ліг) настойліва рыхтуюцца да будучых баталій. Несумненна адно: чэмпіянат атрымаецца цікавы і напружаны. Па-першае, ягоная хуткацечнасць павінна заінтрыгаваць шматлікую армію балельшчыкаў: ну, сапраўды, хіба не цікава будзе ўжо ў першым туры пасачыць за паядынкам каманд, якія трэніруюць два ў недалёкім мінулым сябры-таварышы —Міхаіл Вярцеенка («Дынама», Мінск) і Сяргей Бароўскі («Металург», Маладзечна). А гульня «Ведрычы» з Рэчыцы супраць «Гомсельмаша» таксама ў першым жа туры: напярэдадні сезона калектывы ў літаральным сэнсе слова зрабілі абмен некалькімі ігракамі... Наўрад ці пагадзяцца ўступаць без бою старэйшым у недалёкім мінулым, а цяпер — роўным па званню — футбалісты бабруйскага «Трактара» і лідскага «Абутніка» адпаведна магілёўскаму «Дняпру» і гродзенскаму «Хіміку»... Няпроста будзе і віцебчанам аддаць сімпатыі: адны будуць «хварэць» за КІМ, другія — за СКБ-«Лакаматыў»...

І ў ранейшым нашым флагмане — «Дынама» (Мінск), і ў іншых калектывах у заявачных спісах з'явілася нямала маладых, і, несумненна, таленавітых ігракоў. Не маюць намеру ўступаць і ветэраны... Аб тым, на каго ўскладаюць трэнеры асаблівыя надзеі, мы раскажам крыху пазней— бліжэй да першага тура нацыянальнага чэмпіяната Рэспублікі Беларусь.

Анатоль ФЕДАРАЎ.

ЗАМЕЖЖА

ПРЫГАВОР НЕ ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў ВЫКАНАННЕ

Нечаканы працяг атрымала справа амерыканца з Х'юстана Сцівена Алена Батлера. Напомнім сутнасць: з двух магчымых па прыгавору суда пакаранняў за згвалтаванне 13-гадовай дзяўчынкі ён выбраў кастрацыю, аддаючы перавагу гэтай аперацыі перад турэмным зняволеннем тэрмінам на 99 гадоў.

Але прыгавор аказаўся неканчатковым... Акруговаму судзі Майклу Макспэдэну прыйшлося адмяніць сваё першапачатковае рашэнне: ніводзін з мясцовых хірургаў не жадае аперыраваць злачынцу нават за ядрэнную грашовую плату. Выкананне прыгавору адкладзена.

БЯРЫЦЕ ПРЫКЛАД З КАНАДЦАЎ

АТАВА. Канадцы цяпер ядуць больш здаровы спосаб жыцця, чым два ці тры дзесяцігоддзі назад: яны менш курацъ, менш п'юць, больш займаюцца фізічнымі практыкаваннямі. Праўда, адначасова больш стала людзей, якія скардзяцца на залішнюю вагу.

Скарачэнне колькасці курцоў адбылося ў асноўным за кошт мужчын. Аказваецца, жанчыны менш схільныя расставацца са згубнай прывычкай.

«АДМЫВАЕМ НАЯЎНЫЯ»

НЬЮ-ЙОРК. Прыблізна такога роду рэкламныя аб'явы з'явіліся ў шэрагу буйнейшых амерыканскіх газет у апошнія некалькі дзён. Менавіта такую даволі незвычайную для грамадзян ЗША паслугу прапануе Дзяржаўны банк Пакістана.

У чым яе сутнасць? З гэтага часу любы жадаючы грамадзянін Злучаных Штатаў можа купіць пакістанскія аблігацыі з пяцігадовым тэрмінам пагашэння, выплата па якіх гарантавана ўрадам краіны. Пры гэтым пакупнік не павінен аб'яўляць крыніцу атрымання сродкаў для пакупкі. «Мы не будзем задаваць сваім кліентам непатрэбных пытанняў», — так пракаментаваў сутнасць рэкламы прадстаўнік пакістанскага банка.

АЎТАКАТАСТРОФА З-ЗА ХУЛІГАНСКАЙ ВЫХАДКІ

Каля 10 чалавек загінулі і больш як 20 атрымалі цяжкія раненні ў выніку аўтакатастрофы, якая адбылася ў бразільскім горадзе Рыо-дэ-Жанейра. А віной усяму стала хуліганская выхадка групы маладых людзей: забаўляючыся, яны пачалі кідаць камяні ў праязджаючыя міма іх аўтамабілі.

Адзін з камянёў трапіў у галаву вадзіцеля аўтобуса. Шафёр, атрымаўшы цяжкае раненне, страціў кіраванне. Аўтобус урэзаўся ў групу людзей, якія стаялі на абочыне дарогі, а затым перакуліўся.

Мясцовая паліцыя прыступіла да пошукаў хуліганаў, якія, выкарыстаўшы ўсеагульную разгубленасць, паспелі знікнуць.

ІМІГРАЦЫЯ Ў... ТУРМУ

15 гадоў пазбаўлення волі — такі прыгавор вынес сёння Вярхоўны суд Шры-Ланкі 23-гадовай грамадзянцы Аўстрыі, якая была затрымана ў снежні мінулага года за кантрабанду наркотыкаў, інфармуе індыйскае агенцтва ЮНІ.

У яе быў канфіскаваны 21 грам ачышчанага гераіну. Па законах Шры-Ланкі, за захоўванне толькі двух грамаў наркотыкаў вінаватым выносіцца смяротны прыгавор. Паводле даных паліцыі, гэта першы выпадак, калі суд Шры-Ланкі выносіць прыгавор аб такім доўгім турэмным зняволенні для грамадзяніна замежнай дзяржавы.

Рэспубліка Вануату — невялікая дзяржава на маляўнічых астравах паўднёва-заходняй часткі Ціхага акіяна. Як і ў мінулыя стагоддзі, земляробства з'яўляецца галоўным заняткам мясцовых жыхароў. Тут вырошчваюць какосавыя пальмы — крыніцы высокапажыўнага алею і малака. Добрыя ўраджаі кавы і бавоўны, буйныя лесараспрацоўкі таксама прыносяць важкі здабытак гэтай дзяржаве. Колькасць насельніцтва рэспублікі Вануату нямногім больш за 150 тысяч чалавек, прычым кожны восьмы астравіцянін жыве ў сталіцы — горадзе Віла.

На здымках: малая авіяцыя — галоўны транспартны сродак, які звязвае раскіданыя ў акіяне астравы; з глыбіні стагоддзяў дайшлі да нашага часу ваяўнічыя танцы, мэта якіх — напалохаць злых духаў і ворагаў.

СТО МІЛЬЁНАЎ НА БАРАЦЬБУ СА СНІДам

ДЭЛІ. Індыя атрымае да 1 красавіка гэтага года ад замежных фінансавых устаноў 100 мільёнаў долараў на ажыццяўленне пяцігадовай праграмы барацьбы са СНІДам. Аб дасягненні такой дагаворанасці паведаміла дэпутатам парламента дзяржаўны міністр аховы здароўя і дабрабыту сям'і Д. К. Тхара Дэві Сідхартха.

Па матэрыялах інфармацыйных агенцтваў і друку.

Непальскі гараскоп на наступны тыдзень

З Катманду перадае кар. ІТАР-ТАСС Сяргей Буланцаў.

КАЗЯРОГА паглыне штодзённая руціна, ад якой нікуды не дзіцца. Давядзецца разрываць паміж работай і хатнімі клопатамі. Калі лёс вам усміхнецца, дзень гэта адбудзецца 23 сакавіка. Маладым жонкі адчуюць неабходнасць звярнуцца да ўрача.

ВАДАЛЕЙ, стойка і пакорліва прыміце пасланыя вам выпрабаванні. Неўзабаве абставіны пачнуць мяняцца да лепшага. А пакуль—стан падвешанасці і няпэўнасці. Грашовыя праблемы ўтрасайце 23 ці 28 сакавіка. Магчымы болі ў спіне і скачкі крывянога ціску.

У РЫБ сямейныя непаладкі крыху кампенсуюцца хрустам новенькіх купюр. 26 сакавіка—ідэальны дзень для смелага пачынання і спатнання з каханым чалавекам. Вашы пакуты і скаргі не заўсёды будуць зразумелыя нават самым блізкім людзям.

АВЕНУ падрыхтаваны добры старт у красавіку, калі 25 сакавіка ён дастойна выйдзе з усіх складаных сітуацый. Устрымайцеся ад паспешлівых рашэнняў, асабліва звязаных з пераходам на новую службу. Ваш кашалёк будзе катастрафічна спусташацца. І ўсё ж акуратна плаціце па рахунках. Вечары вам рэкамендавана праводзіць у кругу сям'і.

ЦЯЛЬЦА будуць узмоцнена пераманьваць на новую работу. Добра прыкіньце, ці варта аўчынка вырабу. Калі ваша становішча дастаткова стабільнае, заставайцеся на сваім месцы. Брокер заключыць выгадную здзелку. Закаханыя, будзьце гатовымі да цікавага павароту сардэчных спраў.

БЛІЗНЯТЫ 27 і 28 сакавіка перажывуць эмацыянальны ўздым. Пастарайцеся пазбегнуць памылкі пры заключэнні здзелкі па падваенню капіталу. Грошы лепш аднесці ў Ашчадбанк. Не бойцеся вечароў у поўнай адзіноце.

РАК здзейсніць дабрачынную акцыю. Яна напоўніць вашу душу супанаеннем, прымусіць задумацца пра тленнасць быцця і вечныя каштоўнасці: любоў да блізнага і дабрыню. Любоўная лодка вызваліцца з лядовага палону, але можа трапіць у моцны шторм.

ЛЕЎ. Вам прызначаны поспех і нечаканая здрада. Вы павінны хутка распазнаць свой шчаслівы шанц і не ўпусціць яго. 24 сакавіка будзьце гатовымі да акту вераломства ў адносінах да сябе. Не выключана, што непрыемнасць гэтая неяк звязана з вашым мінулым.

ДЗЕВУ чакае поспех у фінансавым плане і яна дазволіць сабе крыху перадыхнуць. 25 сакавіка пастарайцеся атрымаць адгул. Астролагу здаецца, што ваш бацька будзе адчуваць патрэбу ў дапамозе. Навічок рызыкуе згубіць грошы ў безнадзейнай справе.

Уся моц планетнага прыцягнення накіравана на поспех усіх пачынанняў **ШАЛЯЎ.** Не раздумвайце і дасягнеце поспеху. Ваш энтузіязм прыцягне надзейных партнёраў. 26 сакавіка вас чакаюць вясёлыя забавы.

У СКАРПІЁНА тыдзень пройдзе пад знакамі нахання і выдатнага стану здароўя. Разведзеныя і адзінокія ўступяць у трывалы і шчаслівы шлюбны саюз. Мужчына будзе адчуваць сябе гладыятарам, жанчыне ў самы час уседзіць у сядло амазонкі.

СТРАЛЬЦА манатонная работа давядзе амаль да меланхоліі. Каб развеяць яе, можаце 25 сакавіка дазволіць сабе расслабіцца. Астролаг на рэкамендуе мяняць дзяржаўную службу на работу ў прыватным сектары. Цяжкі перыяд уступіць у завяршальную стадыю. У жанчын пост-бальзакаўскага ўзросту магчымы праблемы са здароўем.

Праграма тэлеперадач

ТЭЛЕБАЧАННЕ

21 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Меркурый.
12.15. Кіназала праграмы «Здароўе».
12.45. 20 мінут рэдактара.
13.05. Асілак. Прамая лінія.
13.55. Г. Х. Андэрсен. «Стойкі алавяны салдацік». Спектакль Тэатра музычнай камедыі Беларусі.
15.55. «Школа памочнікаў», «Шчаня і сямёра гусянят». Мультфільмы.
16.20. «Савітар-Цэнтр». П. Глоба аб практычнай астралогіі.
17.05. Выступленне ўзорнага нацыянальнага дзіцячага ансамбля Беларусі «Зорачка».
17.50. Тэлевізійны «Дзетдом».
18.45. Тэленарыс.
19.00. Панарама.
19.25. Тэлевізійны фестываль «Песню бярыце з сабою». 1-е аддзяленне.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Для чаго ты жывеш? Інфармацыйна-гуманітарная праграма. Хрысціянскае тэлебачанне Сі-Ві-Эн (ЗША).
22.00. «Песню бярыце з сабою». 2-е аддзяленне.
23.10. НІКа.

І канал. Астанкіна

11.25. Музычны кіёск.
11.55. «ЭХ».
12.10. «Фартуна». Конкурс тэлефільмаў.
12.40. Дак. фільм «Мастацтва Фядоскіна».
13.00. Фільмы-балеты Ф. Слідоўкера і А. Тафеля. «Кармэн-сюіта».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Лімпапо.
14.50. Маст. фільм «Сакрэтная місія».
17.00. «Пчала Мая».
17.25. «Восем дзевак — адзін я».
18.35. Канцэрт.
18.50. «Руская тайна нарэйскага «Боінга-747».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Нечаканы» (ЗША).
21.55. «Брава». У перапынку (23.00.) — Навіны.
24.00. «На шляху да Уэмблі». Кубак Англіі па футболу 1992 года.
1.00. Каханне з першага позірку. Дзень 1-ы.

Канал «Расія»

12.00. М-Трэст.
12.30. Пецярбургскія магікане. Уладзімір Атлантаў.
13.00. Весткі.
13.20. Рускі стыль.
13.50. Эскулап.
14.00. Дом на Чыстых прудах прадстаўляе кінастудыю «12-А». 15.30. «Асколні». Мініяцюры А. Аверчанкі выконвае артыст МХАТа І. Кашыцаў.
16.05. «Познер і Донах'ю».
17.00. Мультфільм «Прыгоды Боска».
17.30. Парламенцкі веснік Расіі.
17.45. Тысяча тактаў балета.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Няхай няўдачнік плача...» На прэм'еры спектакля С. Юрскага «Ігракі-XXI».
20.25. «Эскадрон гусар лятучых». 1-я серыя.
22.00. Весткі.
22.25. Праграма «А».

22 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.50. «Чарноў». Маст. фільм.
10.25. Рэгіён. Інфармацыйна-аналітычная праграма.
11.35. «Амега-спорт» прадстаўляе: баскетбольны клуб «Гарызонт».
12.20. Літарынка.
13.00. Эканамічная хваля.
14.15. «Цыганавыя хлопчыкі». Спектакль Беларускага тэатра імя Янкі Купалы.
15.40. Сёння — Сусветны дзень інвалідаў. «Глядзі на мяне, як на роўню».
16.25. Прэзентацыя часопіса «Акно» і літаратурнай студыі «Крыніца» Інвацэнтра.
17.45. «Ранішняя музыка», «Верабейчык». Мультфільмы.
18.05. Запрашаем на вячоркі. Абрад «Радзіны». Іванскі сельсавет Чашніцкага раёна.
19.00. Панарама.
19.20. Дак. фільм «Пралог».
19.50. «Па той бок экрана».
20.00. «Касмічныя прышэльцы». Мультфільм для дарослых. Фільмы 1-ы і 2-гі.
20.35. Калыханка.
20.55. «Каскад».
21.05. «Крок» прадстаўляе...
23.05. Вечарына аўтарскай песні.

І канал. Астанкіна

7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж «Спортлато».
7.45. Спорт для ўсіх.
8.15. Раным-рана.
8.55. Мягчыма ўсё.
9.25. Новыя імёны.
10.15. «Вясёлка».
10.45. Францыя. Просты сакрэт бізнесу. Частка 2-я. «Правінцыяльны магазін».
11.10. Пад знакам «пі».
12.00. Маст. фільм «Багатыя таксама плачуць» (Мексіка).
12.45. Хакей. Чэмпіянат СНД. Паўфінал. У перапынку — Навіны.
14.30. Новае пакаленне выбірае.
15.25. Клуб падарожнікаў.
16.25. «ТВ — Нява». Хто з намі?
16.45. Тэлецыя.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Маст. фільм «Сюжат для двух апавяданняў». Цыкл «Першае каханне».
19.15. «Восем дзевак — адзін я».
19.45. «Залаты дыск» Юрыя Антонава.
21.00. Выніні.
21.50. Брэйн-рынг.
22.50. «Залатыя словы». Мультфільм для дарослых.
23.00. Навіны.
23.25. Зоркі бальнага танца Расіі і ЗША.
23.55. Зроблена ў Егіпце...
0.35. Каханне з першага позірку. Дзень 2-гі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Дак. экран.
8.00. Хочаце — верце...
8.30. «Вера і Анфіса ў школе». Мультфільм.
8.40. Акно.
9.10. Фальклор. «Невядомыя культуры».
10.05. «Суперкніга». Мультфільм. 5-я серыя.
10.30. Аты-баты...
11.00. Чэмпіянат свету і Кубак свету па біятлону.
12.00. Акцыя «Пелікан»... Дабрачынны аўкцыён.
13.00. Весткі.
13.20. «Белая варона».
14.10. «Справа была ў Пянькове».
15.55. У свеце жывёл.
16.55. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
17.55. Кабарэ «Акалесіца».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Маст. фільм «Магі» (Францыя). Фільм 3-ці «Нечаканы выйгрыш».
20.00. Тварам да Расіі.
20.20. Антракт.
20.35. «Эскадрон гусар лятучых». 2-я серыя
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.30. «Не смехам адзіным...» (З. Паперны і Л. Лебядзінская)
23.15. Рок-кафэ.

23 сакавіка, ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

16.30. Фільм-дзецям. «Ваўчаня сярод людзей».
17.30. «Адчыненае акно». Мультфільм.
18.00. «Трыццаць шэсць радасцей». Дак. фільм.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Брэст).
19.35. «Біяграфія падману».
19.50. Іншы экран. Пазнавальна-разважальная праграма.
20.25. Калыханка.
20.45. Ліра. Частка. 1-я.
22.10. Спартыўны тэлекур'ер.
22.30. Ліра. Частка 2-я.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Новае пакаленне выбірае».
8.30. Старыя добрыя казкі. «Снягурачка».
10.15. «Адмірал Ушакоў». Дак. фільм.
10.45. Выступленне ансамбля «Забава».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Дак. фільм «Без грыму».
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. «Гэта было... было...».
14.45. «Давыдаў і Галіяф». Маст. фільм.
15.10. Дак. фільм. «У ліпу маланка не б'е».
15.40. «Машачка». Мастацкі фільм.
17.00. Навіны.
17.25. Футбольны агляд.
17.55. «НЭП».
18.25. Мастацкі фільм. «Я — хросны Пеле».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Новая студыя» прадстаўляе: «Сітуацыя».
21.00. «Аўтарскае тэлебачанне». «ТВ-галерэя». «Аднак». «Рэха».
23.00. Навіны.
23.20. «Відэамікс».
24.00. «Егіпецкія ночы». Фільм-канцэрт.

Канал «Расія»

15.00. «Чараўнік Ізумруднага горада». Мультфільм.
15.45. Дзіцячая гадзіна (з урокам нямецкай мовы).
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Дзеючая мадэль».
17.45. Вольны час. «Калекцыянер».
18.00. Рэжысёр эстрады В. Фісон.
18.30. Антракт.
18.40. Тварам да Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Сны пра Ізраіль. «Алім Хадашым». Фільм 4-ы.
20.20. Н. Тэфі «Замест палітыкі».
20.55. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.20. Пятае кола. Працяг.
23.05. Адзін на адзін пры сведках. І. Шведава.

24 сакавіка, АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. Праграма перадач.
8.45. «Сустрэчы на арэне». Фільм-канцэрт.
9.25. «Вандроўны аўтобус». Мастацкі фільм.
16.30. Фільм — дзецям. «Куды дасхача ранняя пташка».
17.50. «Мудрасць беднай дзяўчыны». Мультфільм.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. «Пра карміла і кармушку».
19.40. Эканамічная хваля. Работнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і прыватнага бізнесу: сапернікі ці партнёры? Прамая лінія. У перапынку (20.25) — Калыханка.
21.00. Тэлебіржа.
21.15. Адкрыты чэмпіянат Мінска па атлетызму.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна.

5.00. Раніца.
7.35. Канцэрт ансамбля песні і танца «Марый Эл».
8.15. «Чароўная палачка». Мультфільм.
8.30. «Як Іванка-дурненькі за цудам хадзіў». Казка.
10.00. Навукова - папулярны фільм «Ахвярапрынашэнне».
10.30. Футбольны агляд.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Рытмічная гімнастыка.
11.55. Канцэрт з твораў Ф. Шапэна.
12.45. Мультфільмы «Малыш і Карлсан», «Карлсан вярнуўся».
13.25. Блакнот.
13.30. «Вам гэта трэба?»
13.45. Гандлёвы рад.
14.00. Навіны.
14.20. «Спартыўныя куміры нашай маладосці». Я. Грышын.
14.45. «Побач з вамі». Мастацкі фільм.
15.55. «Мы малюем». Мультфільм.
16.05. Дзіцячы музычны клуб.
16.45. Разам з чэмпіёнамі.
17.00. Навіны.
17.25. «Як мышаня лятучым стаў». Мультфільм.
17.35. «Ілья Сільвінскі. На заранку сацрэалізму». Фільм 1-ы.
18.15. Хакей. Чэмпіянат СНД. Паўфінал.
20.00. Навіны.
20.40. Мастацкі фільм «Вежа з чорнага дрэва» (Вялікабрытанія).
22.00. Тэма.
22.45. «Канцэрт». Мультфільм для дарослых.
23.00. Навіны.
23.20. Музычны прагноз.
23.40. Футбол. На шляху да Уэмблі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Дамашні клуб».
8.05. Французская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам нямецкай мовы).
9.35. Пятае кола.
11.20. «Кашчэй Бессмяротны». Мастацкі фільм.
12.40. «Міцінскі варыянт».
13.00. Весткі.
15.00. «Чараўнік Ізумруднага горада». 3-я, 4-я серыі.
15.40. Прастора плюс.
16.10. «Першы конкурс аператы і мюзікла».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Хрысціянская праграма. «Жыла-была Гіта».
17.30. Вольны час. «Пад знакам «Рыбы».
17.45. Парламенцкі веснік.
18.00. «Петрадыцыйная медыцына». У перадачы прымае ўдзел А. Чумак.
18.40. Прыватызацыя па-расійску.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Грамадская думка. «Бацькі і дзеці».
19.45. Аўта-шоу.
20.15. «Лін Кэры — адна з соцень». Фільм-канцэрт.
20.35. «Люстэркі».
21.05. «Фатаграфія на памяць». Монаспектакль Я. Шыфрына.
22.00. Весткі.
22.25. Экс-прэзідэнт у Германіі. Аб паездцы М. С. Гарбачова.
22.35. «Уікэнд у Сінгапуры». Дак. фільм.
22.55. «Тайм-брэйк». Тэнісны агляд. Вядучая В. Корбут.
23.25. Музычная праграма.

25 сакавіка, СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. Праграма перадач.
8.45. «Кашка». Мастацкі фільм.
16.30. Фільм — дзецям. «Ліловы шар».
17.45. «Радасць роднай песні». Абрад «Каляды».
18.00. Дак. фільмы «Не страляйце ў музыканта», «Кветнік».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Інфляцыя свядомасці».
19.40. Прафсаюзы: праблемы, каментарыі. Прымае ўдзел старшыня Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі Беларусі Т. І. Чобатава.
20.00. «У горад прыехаў клоун». Фільм-канцэрт.
20.25. Калыханка.
20.45. Гандаль-дайджэст.
21.00. «Амарочка». Кінанарыс.
21.15. «Пярэзвы». Да фестывалю беларускага народнага танца.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Дзіцячы музычны клуб.
8.15. Старыя добрыя казкі. «На залатым ганку сядзелі».
9.25. Навукова - папулярны фільм «Памяці Юрыка, каралеўскага блазана».
10.00. «Брэйн рынг».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Дак. фільм. «Куды плывуць казулі».
11.45. «Відавочнае — невераго-днае».
12.25. Фермата.
12.55. Як дабіцца поспеху.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Сёння і тады.
14.55. «Хто паедзе ў Трускавец?» Мастацкі фільм.
16.05. Фільм — дзецям. «Васьміногі з другога паверха». 3-я серыя.
17.00. Навіны.
17.25. «Польскі вопыт — для Расіі».
17.55. «Песні вясне». Мультфільм.
18.10. Мастацкі фільм «Усё нармальна...»
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Чорная вкрыня».
21.15. Фермата.
21.45. «Сеанс паміж сеансамі».
23.00. Навіны.
23.20. «Гукавая дарожка».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Калекцыянер».
8.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.35. Прызнанне ў каханні.
8.50. Фальклор. «Невядомыя культуры».
9.45. Дакументальная панарама. «Шлях».
10.35. «Няхай няўдачнік плача...» На прэм'еры спектакля С. Юрскага «Ігракі-21».
11.30. «Недапёсак Напалеон III». Мастацкі фільм.
12.40. «Зямельная рэформа».
13.00. Весткі.
15.00. «Чараўнік Ізумруднага горада». 5-я, 6-я серыі.
15.45. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Далёкі Усход».
17.45. Вольны час. «Аўто».
18.00. Паны-таварышы.
18.20. Антракт.
18.35. Тварам да Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «БДТ: учора, сёння, заўтра...» Перадача 1-я.
20.25. «Жадаю Вам...» Мастацкі фільм.
20.55. Я, Гайдар у прэс-цэнтры «Рэспубліка».
22.00. Весткі.
22.20. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
22.50. Дабрачынны вечар на карысць «Марфа-Марыінскай суполкі».

26 сакавіка, ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Кодавая назва «Паўднёвы гром». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі.
16.25. Праграма перадач.
16.30. Фільм — дзецям. «Белы слон».
17.50. «На рынгу». Мультфільм.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. Цягнік спыняецца на 40 хвілін. Рэпартаж з Гродзенскай мытні.
20.05. Лёс, які мы выбіраем.
20.25. Калыханка.
20.45. Тыдзень беларускага ўрада.
21.00. Латарэя ўдачы.
21.05. «Жарт-крок». Гумарыстычная праграма.
21.50. «Калінка». Тэленарыс.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна.

5.00. Раніца.
7.35. Выступленне Узбекскага фальклорнага ансамбля «Шалола».
7.50. «Царэўна-жаба». Мультфільм.
8.20. Старыя добрыя казкі. «Сцяпанава памятка».
9.45. «Сеанс паміж сеансамі».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Пад знакам «пі».
12.20. «Генадзь Гладкоў». Фільм-канцэрт.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Рамансы рускіх кампазітараў.
14.50. «За Вятлугай-рэкой». Мастацкі фільм.
16.00. «Таленты і паклоннікі».
17.00. Навіны.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
18.05. «Карціны па даўнейшаму». Мультфільм.
18.15. Хакей. Чэмпіянат СНД. Паўфінал.
20.00. Навіны.
20.35. Музыка ў эфіры.
22.30. Тэлескоп.
23.00. Навіны.
23.20. Лімпапо.
23.50. Тэлефільм «Рая».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Дамашні клуб».
8.05. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
9.35. «Салют, Амерыка!» Міжнародны фестываль лацінаамерыканскай музыкі.
10.10. Я, Гайдар у прэс-цэнтры «Рэспубліка».
11.10. «Калі я стану веліканам». Мастацкі фільм.
12.40. «Калмыцкі фермер».
13.00. Весткі.
15.00. «Чараўнік Ізумруднага горада». 7-я, 8-я серыі.
15.40. Школа менеджэраў.
16.10. Восень жыцця.
16.25. Музычны клас.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Манера.
17.45. Парламенцкі веснік.
18.00. Вольны час. «Увага: здымаю!»
18.15. Абмяркоўваем праект Канстытуцыі Расіі. Перадача 2-я.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. «БДТ: учора, сёння, заўтра...» Частка 2-я.
20.40. Антракт.
20.55. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.25. На сесіі ВС Расіі.
22.55. Пятае кола. Працяг.
23.40. Расійскі конкурс бальных танцаў у г. Омску.

27 сакавіка, ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Кінанарыс.
9.00. «Час-Не-Чакае». Мастацкі фільм.
15.25. Меркурый.
16.30. Фільмы — дзецям. «Марусіна карусель», «Дзень загадак», «Запіскі Піната».
17.00. «Наша школа — нашы старты». ДЮСШ № 18 г. Мінска.
17.40. Сёння—Міжнародны дзень тэатра. Частка 1-я.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. «Праз церні — да зорак».
19.40. Месячны каляндар агародніка.
20.10. Дак. фільм ВТ «Адназабоніка».
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Сёння — Міжнародны дзень тэатра. Частка 2-я.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Алёнчына курапя». Мультфільм.
7.45. Старыя добрыя казкі. «Чорная курыца, ці Падземныя жыхары».
9.00. Музыка ў эфіры.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. ...Да 16 і старэйшым.
12.05. «Атракцыён». Мультфільм.
12.15. «Клуб падарожнікаў» (з сурдаперакладам).
13.20. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.25. «Падарунак меламану».
14.55. Пераможцы.
15.40. «Каштанка». Мультфільм.
16.10. Рок-урок.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
18.05. Мастацкі фільм. «На паўстанку». Цыкл «Першае каханне».
18.35. «Тэатральныя сустрэчы».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў», «Палітбюро», «Музагляд», «Шоу-біржа», «Хіт-канвеер». У перапынку (23.00) — Навіны.
0.15. «Злачынца прысылаў кветкі». Мастацкі фільм з серыі «Дэрык».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Вольны час. «Увага, здымаю!»
9.05. Англійская мова. 2-гі год навучання.
9.35. Эскулап.
9.45. Пятае кола.
11.30. «Пунсовая кветачка». Мастацкі фільм.
12.40. Фонд «Адраджэнне расійскай вёскі».
13.00. Весткі.
15.00. «Чараўнік Ізумруднага горада». Мультфільм. 8-я, 10-я серыі.
15.40. Прастора плюс.
16.10. «Кенгуру». Спартыўная праграма для падлеткаў.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Паралельныя сусветы.
17.45. Версія.
18.00. Вольны час. «Дамашні клуб».
18.15. Актуальная камера. «Білет у Казань-2».
18.45. «Кот у калпаку». Мультфільм.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «БДТ: учора, сёння, заўтра...». Частка 3-я.
20.40. Мсціслаў Растраповіч. Да 65-годдзя з дня нараджэння.
21.00. «К-3» прадстаўляе: праграмы «Каронка», «Пры сведках», «САС» і мастацкі фільм «Спакуса». У перапынку—Весткі, рэклама, на сесіі ВС Расіі.

28 сакавіка, СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. Праграма перадач.
8.45. «Вясёлае соек». Мастацкі фільм.
10.00. Паказвае Віцебск. Інфармацыйна-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Меркурый.
12.15. В. Брэхт. «Барабаны ўначы». Спектакль Гомельскага абдрамтэатра.
13.55. «Пластылінавая варона». Мультфільм.
14.05. «Азбука выпадковасцей». Дак. фільм.
14.30. «Мы такія розныя». Музычная забаўляльная праграма.
15.40. Справы вайсковыя.
16.25. «Жыццё з песняй». Сямейны ансамбль Дрынеўскіх з в. Тонеж Лельчыцкага раёна.
16.50. Траці тайм.
17.35. «Мелодыі кахання». Творы І. Лучанка выконвае Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі.
18.15. ПІК.
19.00. Панарама.
19.25. Канцэрт-вальс.
20.15. «Пачвара». Мультфільм для дарослых.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. «Дарога да вечнай любові». Інфармацыйна-гуманітарная праграма. Хрысціянскае тэлебачанне «Сі-Ві-Эн» (ЗША).
22.30. Мастацкі фільм. «Дом без выхаду».
24.00. НІКа.

І канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзікавога чалавека.
7.30. Тэлефільм. «Я рад сустрэчы з вамі».
8.10. Мультфільмы «Боўчая шкура», «Вогнік», «Мартышка і смычкі».
8.45. ЭХ.
9.00. Раніцная музычная праграма.
9.30. Цэнтр.
10.10. Гонг.
11.25. Гэта вы можаце.
11.55. Жылі-былі.
12.25. Марафон-15.
13.15. Фільмы-балеты Ф. Слідоўкера і А. Тафеля. «Пазмы».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Валейбол. Чэмпіянат Расіі. Мужчыны.
14.40. «Кіно да запатрабавання».
15.40. У свеце жывёл.
16.25. «Чырвоны квадрат».
17.05. «Пчала Мая».
17.30. «КВЗ-92».
19.15. Палітычная кухня.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Мастацкі фільм «Грэх ліцадзейства».
23.00. Навіны.
23.25. «Каханне з першага погляду». Дзень першы.
0.05. «Ракавое спатканне». Фільм з серыі «Дэрык».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Наш сад.
7.50. «Камар Камаровіч». Мультфільм.
8.00. Баскетбольны агляд НБА.
8.30. Цырк на сцэне. «Марафон дурняў».
9.00. «Пілігрым.
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. «Як жыць будзем?»
12.00. «Школа ў зменлівым свеце».
13.00. Весткі.
13.20. Кінафільм «Свой крыж».
14.45. Балгарыя: вопыт і надзеі.
15.25. «Вурда модэн» прапануе...
15.55. «Познер і Донах'ю».
16.50. «Прыгоды Боска».
17.20. Парламенцкі веснік.
17.35. «Задворкі-3». Дабрачынны вечар тэатра Леннам.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Музыка ў стылі пепсі.
21.00. «Зусім сакрэтна».
22.00. Весткі.
22.25. «Маскі-шоу».
22.55. «Бландзінка за вуглом». Мастацкі фільм.

29 сакавіка, НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Рамео і Юлія». Фільм-канцэрт.
9.00. Прыгодніцкі фільм. «Дом без выхаду».
10.30. Гамбіт. Шахматны клуб.
11.00. Час пісьма.
12.00. Бізнесклуб «Партнёр».
13.... НІКа. Нядзельны дадатак.
13.45. Фільм—дзецям. «З рабатамі не жартуюць».
14.55. Музыка маёй рэспублікі.
15.15. «Добры дзень у хату!» СШ № 108 г. Мінска.
15.50. «Чабарок». Выступленне дзіцячага фальклорнага калектыву Палаца дзяцей і моладзі г. Мінска.
16.35. Вецер вандраванняў.
17.15. «За годам — год». Да 60-годдзя пісьменніка У. Карпаза.
18.00. Група «Форум» у Віцебску.
19.00. Панарама.
19.20. Запрашаем на вячоркі.
20.25. Калыханка.
20.45. «Каскад».
20.55. Кінастужкі мінулых гадоў. «Прыходзьце заўтра».
22.30. «Дайджэст».

І канал. Астанкіна

6.00. Рытмічная гімнастыка.
6.30. Тыраж «Спортлато».
6.45. «Дапамажы сабе сам».
7.15. Раным-рана.
7.55. «Магчыма ўсё».
8.25. Раніцная зорка.
9.15. «Вясёлка». «Непараўнальнае майстэрства кітайскага нацыянальнага тэатра» (Кітай).
9.50. «Лімпапо».
10.20. «Як лісы з курамі пасябравалі». Мультфільм.
10.40. Фільм з серыі «Багатыя таксама плачуць» (Мексіка).
11.45. Хакей. Чэмпіянат СНД. Фінал. У перапынках — Навіны.
13.20. Дыялог у прамым эфіры.
14.00. Ступень да Парнаса.
14.25. «Шмат галасоў — адзін свет».
14.35. «Хто з намі?» Перадача 5-я.
14.55. Клуб падарожнікаў.
15.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.45. Навіны.
17.00. Рэпартаж ні аб чым.
17.20. Тэлецыя.
17.30. Цудоўныя мелодыі. І. Штраус (Германія).
18.15. Фільм-спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя У. Маякоўскага «Смех лангусты».
20.00. Выніні.
20.45. Сёння.
22.00. Навіны.
22.25. «Каханне з першага погляду». Дзень другі.
23.05. У свеце матораў.

Канал «Расія»

6.00. Весткі.
6.20. Мегаполіс.
6.50. «Дзядулева дудачка». Мультфільм.
7.00. «Хочаце верце...»
7.30. «Музычная калекцыя».
7.45. «Вясёлыя хлопцы» запрашаюць...
9.00. «Суперкніга». Мультфільм. 6-я серыя.
9.30. Аты-баты...
10.00. Здароўе.
10.30. «Чужыя пісьмы». Мастацкі фільм.
12.00. Весткі.
12.20. Фрыстайл. Чэмпіянат Еўропы і Кубак Еўропы. Балет.
12.50. «Старыя...»
13.30. Ж.-Б. Мальер. «Мізантроп».
16.00. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
17.00. Антракт.
17.25. «Фарс-мажор».
18.00. Весткі.
18.20. Свята кожны дзень.
18.30. Маст. фільм «Магі» (Францыя). Фільм 4-ы «Тэлевізійныя непаразумкі».
19.00. Тварам да Расіі.
19.20. Памяці А. Ільчанкі.
21.00. Весткі.
21.20. Спартыўная карусель.
21.30. «Дэмінус». Мастацкі фільм.
22.30. «Рок-кафэ».

ФІРМА «БАЛТАРУСІЯ»

◆ ПРАДАЕ за наўўны ці безнаяўны разлік КУРТКІ З ПЛАШЧАВОЙ ТКАНІНЫ розных мадэлей;

◆ КУПІЦЬ ТКАНІНУ плашчавую, ФУТРА ШТУЧНАЕ, «МАЛАНКІ», ШВЕЙНЫЯ СТАНКІ кл. 1022 за наяўны ці безнаяўны разлік;

◆ ЗАПРАШАЕ НА РАБОТУ спецыялістаў па пашыву верхняга адзення (магчыма работа на даму).

◆ ВЫКОНВАЕ БРУСАВАННЕ (знімце скуры па таўшчыні, шырыня крою—не больш як 38 см, звяртацца з 9.00 да 18.00 апрача нядзелі па адрасу: Мінск, вул. Аэрадромная, 2-а, тэл. 27-23-85).

НАШ АДРАС:
Мінск, вул. К. Маркса, 20.
ТЭЛ. 27-23-85
з 9.00 да 18.00 (апрача выхадных).

КРЫЖАВАНКА



ПА ГАРЫЗАНТАЛЯХ: 3. Лёгкае пакрывала ў жанчын-мусульманак. 8. Кароткае выкладанне зместу кнігі, артыкула. 9. Грашовая адзінка Венесуэлы. 11. Орган руху некаторых водных істот. 13. Невялікі лірычны твор, накладзены на музыку. 15. Мінеральная вада 16. Трагедыя У. Шэкспіра. 18. Млекакормячае атрада грызуноў з іголнападобнай шэрсцю. 20. Цягавая машына чыгуначных саставаў. 22. Службовая асоба, якая выконвае праверкі. 25. Вадзяны знак на паперы. 28. Калектыў артыстаў тэатра, цырка. 31. Хімічны элемент, метал. 32. Дапаможная шкала ў некаторых вымяральных прыборах. 33. Сутыкненне супрацьлеглых поглядаў, імкненняў, інтарэсаў. 35. Раённы цэнтр у Гомельскай вобласці. 36. Асадачная горная парода, якая складаецца із глины і вапняку. 37. Пладовае дрэва.

ПА ВЕРТЫКАЛЯХ: 1. Пісьмовы дагавор, пагадненне. 2. П'еса А. Макаёнка. 4. Аб'ява, паведамленне, выкананыя ў папулярнай форме. 5. Лесвіца на караблі. 6. Глінянае пасудзіна з вузкім горлам. 7. Раман А. Фадзеева. 10. Назва французскіх партызан у часы другой сусветнай вайны. 12. Міжнародны дагавор. 14. Задыяльнае сузор'е. 15. Кінаартыст і клоун, народны артыст СССР. 16. Задор, запал. 17. Літара грэчаскага алфавіту. 19. Буйнае марское млекакормячае. 21. Зямельная мера ў Англіі. 23. Поле, падрыхтаванае для сяўбы або ўжо засеянае. 24. Чалавек, які здрадзіў сваім перакананням, адступнік. 26. Гаспадарчая дзейнасць па куплі і продажу тавараў. 27. Бог кахання ў рымскай міфалогіі. 29. Прадмет, які захоўваецца як памяць аб мінулым. 30. Тасьма для ўпрыгожання адзення або мэблі. 33. Мера даўжыні, роўная шырыні далоні. 34. Спартыўны снарад.

Склаў Мікола ВОРЧЫК.
Лагойскі раён.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ 14 САКАВІКА



ФІЛЬМЫ ТЫДНЯ

● «ТАТУЛЬКА І МЭМ»
● «ЦІХІ ДЖОН»
● «ПАСТКА ДЛЯ АДЗІНОКАГА МУЖЧЫНЫ»
● «ПА-ЗА ЗАКОНАМ»

Новую каляровую мастацкую кінастужку «ТАТУЛЬКА І МЭМ» перадаюць на суд гледачоў камерцыйны «Масбудбанк» і кінафірма «Альянс».

Перад намі гісторыя кахання, але не юных Рамэо і Джульеты, а...іх бацькоў, дарослых саракагадовых людзей, якім выпала рэдкае шчасце знайсці і пакахаць адзін аднаго. Любоўная навела тонка і пранізліва, з мноствам падрабязнасцей і нюансаў блізкажнага пачуцця ўвасоблена на экране цудоўнымі Любоўю Палішчук і Георгіем Тараторкіным. Каханне робіць герояў шчаслівымі і моцнымі, але адначасова слабымі і безабароннымі перад людзьмі і складанымі жыццёвымі абставінамі. Ім патрэбна шмат сіл, каб захаваць і зберагчы сваё пачуццё і ад чужога недарэчнага слова, і ад зайздроснай помсты. Але лёс, акрамя розных бытавых праблем, падрыхтаваў ім выпрабаванне, якое стане вынікам іх адносін.

Карціну пастаўлена рэжысёрам Аляксандрам Мар'янавым па свайму сцэнарыю.

Выходзіць на экраны рэспублікі новая каляровая мастацкая кінастужка «ЦІХІ ДЖОН» вытворчасці незалежнай прыбалтыйскай кінастудыі «Артур і Джэральд фільм».

Гэта своеасаблівая пародыя на сучасныя кінабаевікі. Яе герой — малады чалавек, які вярнуўся з турмы і вельмі хоча разбагацець. Але паколькі гэта ўсё ж такі камедыя, то, каб «разбавіць» сюжэт і трох персанажаў, уводзяцца і былая палюбоўніца галоўнага героя, і яе новы кавалер, які ахвотна згаджаецца дапамагчы былому сумыцелю сваёй знаёмай, і прыдуркаваты слабар ухажора. Усе дружна палююць за мафіозі...

У галоўных ролях заняты Робертас Байдотас, Альгірдас Яцунскас, Ева Банюліта.

На наступным тыдні будзе таксама паказвацца каляровая мастацкая кінастужка «ПАСТКА ДЛЯ АДЗІНОКАГА МУЖЧЫНЫ», п